Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 7 (3911)
ЧАЦЬВЕР, 8 СТУДЗЕНЯ
1931 г.

Цана нумару 5 коп.
Выходзіць
БЕСЬПЕРАНЬНЯ

Рыхтавацца да новага будаўнічага сэзону

Трэці рашаючы год пяцігодкі, у які мы ўступілі, ставіць перад намі адказьнейшыя задачы ў галіне капітальнага будаўніцтва.

Вялізарныя посьпехі будоўлі другога году пяцігодкі, дасягнутыя на аснове мінухільнага ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі, зьяўляюцца лепшым адказам апартуністам, якія енчылі і енчаць аб «непасільнасьці» тэмпаў.

Аб'ём капітальных работ у сацыялістычнай прамысловасьці ВСНГ у 3-м рашаючым годзе пяцігодкі вызначаны апошнім аб'яднаным пленумам ЦК і ЦКК УсеКП(б) у разьмеры 5,5 мільярдаў руб. Зьніжэньне сабекошту будаўніцтва вызначана пленумам у разьмеры 12%.

Гэты вялізарнейшы плян, які завяршае пабудову фундаманту сацыялізму ў нашай краіне, павінен прыцягнуць да сябе ніваспабную ўвагу пралетарскіх мас, нашых будаўнічых і гаспадарчых арганізацый.

Вопыт мінулага будаўнічага сэзону павінен быць улічан нашымі гаспадарчымі арганізацыямі.

Павінны быць улічаны, каб іх не паўтараць, і недахопы мінулага будаўнічага сэзону.

Папярэдняе азнаямленьне з вынікамі мінулага будаўнічага сэзону па БССР гаворыць аб тым, што важнейшая дырэктыва партыі і ўраду аб зьніжэньні сабекошту будаўніцтва ня выканана. Наадрэ пабудоў замест зьніжэньня мы маем нават павышэньне сабекошту.

Асноўнай прычынай гэтага зьяўляецца тое, што часта вялізарнае будаўніцтва пачыналася без адпаведных праектаў і рабочых чарцяжоў. Такія факты мы мелі і на КРЫЧАЎСКІМ ЦЭМЭНТНЫМ ЗАВОДЗЕ, НА НОВА-БЕЛІЦКІМ КАМБІНАЦЕ і на інш. пабудовах. Гэта прыводзіла ў некаторых выпадках да перарабок.

Нельга ня спыніцца і на нядобраякаснасьці некаторых праектаў. Тлумачыцца гэта тым, што людзі, якія складалі праекты, не адчувалі адказнасьці за даручаную ім справу. Уже раз складзеныя праекты прыходзіліся перарабляць.

Усё гэта, зразумела, ударажала будаўніцтва, затрымлівала яго ход, расцягваючы яго на некалькі сэзонаў. Мільёны рублёў, укладзеныя ў будаўніцтва, заставаліся ляжаць мёртвым капіталам.

Характэрным прыкладам гэтага зьяўляюцца зьмешчаныя намі факты аб практыцы будаўніцтва Крычаўскага цэмэнтнага заводу і Нова-Беліцкага камбінату.

З прычыны несвоячасовага прадстаўленьня праектаў і заводу абсталяваньня, марудных тэмпаў будаўніцтва — затрымліваецца сканчэньне пабудовы і пуск двух новых вялізарных прадпрыемстваў БССР.

Вуроні мінулага будаўнічага сэзону павінны быць зараз дасканала ўлічаны і вывучаны нашымі будаўнічымі арганізацыямі.

Да пачатку новага будаўнічага сэзону засталося ўсяго некалькі месяцаў. Пасьпяховае яго правядзеньне патрабуе, каб падрыхтоўка да будаўніцтва была разгорнута ЗАРАЗ-ЖА.

ВСНГ і аб'яднаньні павінны не марудзіць з вызначэньнем аб'ектаў пабудоў. У першую чаргу трэба скончыць будаўніцтва, пачатае ў мінулым годзе.

Новае будаўніцтва неабходна зараз-жа забясьпечыць праектамі і рабочымі чарцяжамі. Своячасовае вызначэньне месца пабудовы дасьць магчымасьць скарыстаць санны шлях для падвозкі будаўнічых матар'ялаў.

У мінулым сэзоне мы мелі факты, калі будаўнічыя работы затрымліваліся з прычыны несвоячасовай вывазкі матар'ялаў, асабліва ў сельска-гаспадарчым будаўніцтве. Рабочыя, якія прыбывалі на пабудовы з-за непадрыхтаванасьці будаўнічых арганізацый, прымушаны былі перажіджаць з адной пабудовы на другую. Усё гэта, зразумела, адбівалася на сабекошце будаўніцтва.

Правільная арганізацыя работ, своячасовая заяўка на рабочую сілу і вызначэньне месца пабудовы, забясьпячэньне праектамі першачарговых пабудоў — вось асноўныя ўмовы для выкананьня дырэктывы ўраду аб зьніжэньні сабекошту, аб захаваньні каляндарных пляноў будаўніцтва і паскарэньня абароту капіталаў, якія мы ўкладаем у народную гаспадарку.

Рацыяналізацыя будаўнічых работ, замена дэфіцытных матар'ялаў недэфіцытнымі, мясцовымі — ня менш адказная задача, якая паўстае перад нашымі арганізацыямі.

Некаторыя саюзныя будаўнічыя арганізацыі, як «Ореховстрой», на справе давялі, што нормы ЭКАНА для жыльлёвага і грамадзянскага будаўніцтва даўно аджылі.

Кожная бочка цэмэнту, кожная тона мэталю, кожны вагон цэглы, якія можна з'эканоміць на гэтых вучастках будаўніцтва, значна паскораць тэмпы нашага прамысловага будаўніцтва.

Практыка «Ореховстроя» павінна быць зараз-жа вывучана нашымі будаўнічымі арганізацыямі, прыстасавана да нашых умоў і перанесена на будоўлі БССР.

Вялікія будаўнічыя работы праходзяць ва умовах абвостранага клясавага змаганьня. Клясавы вораг праз сваіх агентаў будзе прабаваць зрываць, тармазіць гэтыя работы.

Больш чым калі-б там ні было патрэбна пралетарская пільнасьць на ўсіх вучастках будоўлі.

Выкрываць шкоднікаў, весьці бязьлітасную барацьбу з агентамі кулака — правымі і іх саюзьнікамі «левымі» апартуністамі, з апартуністычнай практыкай у рабоце будаўнічых арганізацый — гэта важнейшыя ўмовы пасьпяховага выкананьня будаўнічай праграмы трэцяга году пяцігодкі.

Інтэрвэнты падрыхтоўваюць вайну

МЫТНЫ БЛЁК СУПРОЦЬ СССР

НОВАЯ ФРАНЦУСКАЯ ПАДАЧКА РУМЫКІІ

ПАРЫЖ. Даючы тлумачэньні ў фінансавай камісіі палаты дэпутатаў з поваду чутак аб пазыках чужаземным дзяржавам, міністр фінансаў ураду Тардзьдзе Поль Рэйно вымушан быў прызнацца, што «сяную-тую суму Румыніі даць прыдзецца». Гэта заява паслужыла поводам для ўзьнясеньня тае. Кашэнам ад імя камфракцыі палаты запытаньне новаму ўраду Стэга—ці маркае новае, нібы «дэмакратычнае» міністэрства пайсьці на сьлядох ураду Тардзьдзе і даць румынскаму фашысцкаму ураду грошы, якія прызначаюцца для ўзбраеньня румынскай арміі і для падрыхтоўкі антысавецкай вайны.

Адпак, Стэг распусьціў палату на калядныя канікулы і запытаньне ня будзе абмяркоўвацца раней палоўны сьнежня.

Між тым уже ў канцы сьнежня павінны закончыцца перагаворы паміж румынскім урадам і францускімі банкірамі, якія дзейнічаюць са згоды францускіх кіруючых колаў. 600 мільёнаў зноў трапяць у ракі румынскіх міністраў і, наколькі яны ня будуць расхрадзены, пойдуць на закупку ўзбраеньня ў Францыі для падрыхтоўкі нападу на СССР.

Як вядома, у 1928 годзе ў эпоху заключэньня франка-румынскай ваеннай канвэнцыі і пачатку інтэрвэнцыяністкіх перагавораў паміж кіраўнікамі францускага генэральнага штабу і дзеячамі шпіёнска-шкодніцкай «прэмпартыі», Пуанкарэ, які быў тады старшынёю рады міністраў, прадставіў Румыніі пазыку ў 1.800 мільёнаў франкаў. Значная частка гэтай вялізарнай сумы прыйшла да рук румынскіх палітычных і ваенных дзеячоў, а рэшта пайшла ў бязьлонье ваенных паставак і закупак узбраеньня.

Цяпер з прычыны ажыцьцяўленьня інтэрвэнцыяністкіх плянаў, румынская прыдворная і ваенная камарыльля спадзяецца атрымаць новую падачку ад шчодрага добрачынцы—Францыі.

Аб адзіным фінансавым пляне і дзяржаўным бюджэце на 1931 г.

ДАКЛАД тав. ГРЫНЬКО НА СЭСІІ ЦВК СССР

— Упяршыню, — кажа дакладчык, — сэсія абгаварвае адзіны фінансавы плян. Пераход да адзінага фінансавага пляну — ня тэхнічная зьмена, а вынік гігантскага ўзмацненьня і кансалідацыі нашае гаспадаркі. Фінансавая рэформа, якая пакончыла з вэксальным камэрцыйным крэдытаваньнем, была першым крокам да ажыцьцяўленьня адзінага фінпляну. Наш фінансавы плян на 1931 год ахапляе $^{2}/_{3}$ усяго народнага даходу — 32 мярд. з 45 мярд., між тым, як да канца пяцігодкі ён павінен быў ахапіць палову ўсіх даходаў. Такое павялічэньне фінансавага пляну вызначае, зразумела, і труднасьці пры яго выкананьні. Усе наныя разьлікі павінны будавацца на унутраным накапленьні і ноўным іх выкарыстаньні. Тэмпы прыросту народнага даходу, якія назіраюцца ў нас, ня маюць прэцэдэнтаў. У той час, калі заграніцай прырост складае 3-4, у лепшым выпадку, 5-6 проц., мы мелі на працягу апошніх 2-х год 11½ і 20%, а у 1931 годзе праектуем 35 проц. Такія тэмпы росту народнага даходу магчымы толькі пры сацыялістычнай гаспадарцы, але не пры капіталістычнай. Дастатковa сказаць, што Англія траціць на ўзбраеньне і пакрыцьцё даўгоў, якія таксама зьвязаны з выдаткамі на ўзбраеньне, 54% свайго бюджэту, Італія—43%, Польшча — 40%, Францыя — 55%, а мы толькі — 8%.

Тав. Грынько ўказвае на неабходнасьць пашырэньня пазыковае работы на вёсцы і ўзмацненьня работы сялчадкас.

Другую частку свайго дакладу тав. Грынько прысьвячае характарыстыцы выдатковай часткі фінансавага пляну. З 31 мільярда 850 млн. рублёў, якія складаюць даходную частку пляну, на выдатковыя артыкулы прыпадае 30 мярд. 200 млн. рублёў, 1½ мільярды пакідаюцца ў рэзэрв. З агульнай сумы выдаткаў — на фінансаваньне народнае гаспадаркі адпускаецца 21 мільярд, на фінансаваньне культурнага будаўніцтва прызначаецца 6,5 мільярдаў рублёў. Нагуз $^{4}/_{10}$ усіх выдаткаў у 1931 годзе ідуць па лініі гаспадарчага і культурнага будаўніцтва. У гэтым, — кажа тав. Грынько, — і заключаецца сакрэт росту нашага даходу. Ні адна капіталістычная дзяржава ня можа дабіцца такіх посьпехаў, як у нас, іменна таму, што кірунак выдаткаў у іх зусім іншы. Той факт, што з 31 мільярда мы пускаем у выдатак толькі 30 мільярдаў рублёў, паказвае, што мы разгортваем свой бюджэт ня толькі не зьвяртаючыся да эмісіі грашовых знакаў, але наадварот, стваравоны рэзэрв у паўтара мільярда рублёў. Пры гэтым дакладчык спасылаецца на тое, што праведзеныя намі ва ўдарным квартале абожжазагатоўкі ў агульнай складанасьці на 2,5 мільярды руб. былі ажыцьцёўлены без эмісіі.

Наш фінансовы плян,—заканчвае тав. Грынько,—зьяўляецца адбіткам вялізарных тэмпаў нашага сацыялістычнага будаўніцтва. Гэты плян максымальна стабілізацыі народных рэсурсаў, плян далейшага наступленьня на капіталістычныя элементы, плян узмацненьня абароназдольнасьці нашае краіны, плян кансалідацыі народных мас вакол саветаў для выкананьня вялікіх задач сацыялістычнага будаўніцтва.

Сакрэтны ваенны дагавор паміж Бэльгіяй і Францыяй

БЭРЛІН. Мілітарысцкая палітыка Францыі пачынае выклікаць трывогу ў палітычных колах краін, якія знаходзяцца у арбіце францускага ўплыву. У эўрапейскім друку ў апошні час усё больш часта ставіцца пытаньне аб пазыцыі Бэльгіі ў выпадку вайны. У гэтым сэнсе цікава адзначыць нядаўні артыкул дыплёматычнага карэспандэнта «Дэйлі Тэлеграф» Гэртоулы. У гэтым артыкуле карэспандэнт указвае, што ў выпадку вайны бэльгійскі ўрад будзе захоўваць нейтралітэт.

Праз некаторы час у органе бэльгійскіх эканамістаў «Пэпль» зьявіўся артыкул былога міністра замежных спраў, лідэра II Інтэрнацыяналу Вандэрвэльдэ, які прызнае, што побач з дагаворамі існуюць сакрэтныя ўмовы францускага і бэльгійскага генэральных штабаў.

Адзначаючы далей, што франка-бэльгійскі ваенны дагавор поўнасьцю прыкрываецца Лёкарнскім дагаворам, Вандэрвэльдэ піша:

«Калі франка-бэльгійскі ваенны дагавор прадугледжан і зьяўляецца часткай больш шырокага Лёкарнскага дагавору, дык ці ёсьць сэнс існаваньня першага дагавору, як дыплёматычнай крылады?».

Выступленьне Вандэрвэльдэ выклікала неадабрэньне францускага буржуазнага друку, у прыватнасьці «Тан» і «Эко дэ Парыж».

Яшчэ адзін антысавецкі блёк

ЛЁНДАН. Паводле паведамленьня капэнгагенскага карэспандэнта «Файненшэл Таймс», перагаворы, якія адбываюцца паміж Даніяй, Ісляндыяй, Нарвэгіяй, Швэцыяй і Галяндыяй аб мытным блёку, разьвіваюцца пасьпяхова. Па словах карэспандэнта арганізацыі прадпрыемцаў Фінляндыі і Бэльгіі выказаліся за афіцыйны ўдзел сваіх урадаў у гэтых перагаворах. Дзяржавы, аб якіх гаворыцца, знаходзяцца ў сферы ўплыву францускага і ангельскага капіталу.

У выпадку, калі-б блёк гэтых сямі (ці прарыльней васьмі, калі лічыць Люксембург) дзяржаў сапраўды з'арганізаваўся, ён быў бы накіраваны ў сэнсе прамысловым супроць Нямеччыны, а ў сэнсе сельска-гаспадарчым і лесаэкспартным супроць СССР. Няма сумненьняў, што франка-брытанскі капітал спрабуе выкарыстаць указаныя перагаворы для сваіх палітычных мэт.

Камэра катаваньняў у Луцку

Зах. Украіна пад ботам польскага пана

БЭРЛІН. Тут атрыманы паведамленьні, якія дапаўняюць новымі данымі жудасны малюнак фашысцкага тэрору на Заходняй Украіне. Паводле гэтых паведамленьняў катаваньні ў паліцэйскіх засьценках Заходняе Украіны зрабіліся сыстэмай і практыкуюцца пад апекай адміністрацыйнае улады. У Луцку набыў громкую ядомасьць пам. начальніка паліцыі Сяргей Заромба, якога завуць «катам Валыні». Сяргей Заромба зьяўляецца ўласьнікам аўтамабільнай транспартнай канторы і ўладае вялікімі сродкамі. Ён зьяўляецца асабістым прыяцелем ваяводы (губэрнатара) Юзэфскага і часта паўтарае, што Юзэфскі ня дасьць яго ў крыўду. Зарамба часта расказвае сам аб тым, што ім абсталяваны спэцыяльны пакой для розных катаваньняў, дзе маюцца ўсе новыя прылады катаваньня.

У спрадзіне лістапада былі арыштаваны ў Львове 20 чал., сярод якіх 4 жанчыны, па абвінавачваньні ў прыналежнасьці да камуністычнае партыі Заходняе Украіны. Аб абвінаваньні і катаваньнях арыштаваных, якія бліжэй высьвечаны ў Луцк, ходзяць на Львове розныя чуткі. Лёс іх да гэтага часу невядомы. Адзін арыштаваны, які быў выпушчаны на волю, Козак расказвае, што яго дапытвалі наступным чынам: праз трубку жывот напаўняўся вялікай кількасьцю вады, так што дапытваемы зусім спух; пасьля гэтага паліцэйскія сялі на яго і націскалі на жывот усёй цяжарнасьцю цела да таго, што вскрэмэнты выступалі праз рот. Пасьля шматразовага паўтарэньня гэтае аперацыі, яму надзявалі пяткі.

Зусім пячуваным катаваньням падвяргаліся маладыя рабочыя, якія былі арыштаваны ў кастрычніку на абвінавачваньні ў прыналежнасьці да камсамолу.

У Луцкай турме сядзіць цяпер капа 400 палітзьняволеных ва ўзросьце ад 18 да 20 год.

„Тыдзень Сазецкай Беларусі" ў Маскве

ВЕЧАР ЗМЫЧКІ ГАСПАДАРНІКАЎ БССР І МАСКВЫ

МАСКВА. 6 СТУДЗЕНЯ У ДЗЕЛАВЫМ КЛЮБЕ ІМЯ ДЗЯРЖЫНСКАГА АДБЫЎСЯ ВЕЧАР ЗМЫЧКІ ГАСПАДАРНІКАЎ БССР І МАСКВЫ.

ПРАДСТАЎНІКІ РАДУ МАСКОЎСКІХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ РАСКАЗВАЛІ БЕЛАРУСКІМ ГАСЬЦЯМ АБ СВАІХ ДАСЯГНЕНЬНЯХ І АБЯЦАЛІ АКАЗАЦЬ БРАЦКУЮ ДАПАМОГУ ПРАЛЕТАРЫЯТУ БССР У ІНТАРЭСАХ ДАЛЕЙШАГА РОСКВІТУ САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ.

6-ГА СТУДЗЕНЯ У КАМУНІСТЫЧНЫМ УНІВЭРСЫТЭЦЕ НАРОДАЎ ЗАХАДУ АДБЫЛОСЯ УРАЧЫСТАЕ ПАСЯДЖЭНЬНЕ СЛУХАЧОЎ УНІВЭРСЫТЭТУ СУМЕСНА З ДЭЛЕГАЦЫЯЙ БССР.

РЭЗАЛЮЦЫЯ БЮРО ЦК КП(б)Б

ПА ДАКЛАДУ МЕНСКАГА ГАРАДЗКОГА САВЕТУ

Бюро ЦК канстатуе рад дасягненьню у рабоце Менскага гарадзкога савету, якія заключаюцца ў значным пашырэньні гарадзкой прамысловасьці, пасьпяховым выкананьні плянаў другога году пяцігодкі, значным росьце рабочых кадраў, ліквідацыі беспрацоўя і павышэньні матар'яльна-культурнага ўзроўню рабочых мас (рост заработнай платы, уцягненьне ў вытворчасьць іншых членаў сем'яў рабочых, разгортваньне жыльлёвага будаўніцтва і пашырэньне грамадзянга харчаваньня), у значным разгортваньні культурнага будаўніцтва, прыкладнымі ўсягаўнага навучаньня, у актыўным удзеле гарсавету ў арганізацыі і пашырэньні ВНУ, ВТНУ і тэхнікумаў, а таксама ў правядзеньні раду мерапрыемстваў па палепшэньні дабрабыту гораду (пабудова трамваю, пашырэньне электрастанцыі, частковая каналізацыя і г. д.).

Аднак гэтыя дасягненьні зьяўляюцца зусім невыстарчальнымі і работа Менскага гарсавету ў радзе важнейшых галін застаецца незадавальняючай. Бюро ЦК адзначае наступныя буйныя недахопы ў рабоце гарсавету:

а) пры нялучнасьці вялізарнага ўдзелу актыўнасьці рабочае масы г. Менску, масавая работа гарсавету разгорнута надзвычай слаба і яна адстае ад масавай актыўнасьці рабочых. Ажыцьцяўленьне новых форм сувязі гарсавету з шырокімі рабочымі масамі на прадпрыемствах (дэпутацкія групы, дзяжурствы членаў гарсавету на прадпрыемствах і інш.) не знайшлі месца ў рабоце гарсавету; работа гарсавету на ўцягненьні ў актыўную работу ўсіх членаў гарсавету і стварэньні шырокага рабочага актыву вакол гарсавету таксама зьяўляецца невыстарчальнай.

Пры нацучнасьці вялізарнай актыўнасьці рабочых мас і ўдзьму вакол вырашэньня асноўных задач сацыялістычнага будаўніцтва, Менскі гарадзкі савет яшчэ ня стаў на-сапраўднаму на чале актыўнасьці мас, не разгарнуў адпаведнай работы па мабілізацыі пралетарскіх мас вакол асноўных задач сацыялістычнага будаўніцтва (выкананьне прамфінпляну, надзвычайнае і ўзмацненьне працдысцыпліны на прадпрыемствах, палепшэньне якасьці прадукцыі і г. д.) замест таго, каб паставіць на першы плян сваёй штодзённай работы інтарэсы вытворчасьці і не абслугоўваньня. Гарсавет вельмі часта заставаўся ў баку ад асноўных задач, ня прымаў актыўнага ўдзелу ў іх вырашэньні, не забясьпечыў выстарчальнага кіраўніцтва. Усё гэта сьведчыць аб тым, што работа Менскага гарсавету адстае ад агульных тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва, што карэнная перабудова ўсёй работы гарсавету ў напрамку павароту тварам да вытворчасьці і ўдарніцтва працякае марудна.

б) Не гледзячы на значнае будаўніцтва новых дамоў, тэмпы жыльбудаўніцтва адстаюць ад тэмпаў росту прамысловасьці і запатрабаваньняў працоўных гораду. Рост працоўнага насельніцтва і пашырэньне вытворчасьці патрабуюць значнага павялічэньня праграмы жыльбудаўніцтва з боку гарсавету і прамысловасьці, а таксама разгортваньня большай ініцыятывы з боку будаўнічай кааперацыі.

в) Таксама вусім незадавальняючай зьяўляецца работа Менскага гарсавету на дабрабыце гораду: электрастанцыя і валаправод працуюць з вялікімі перабоямі і патрабуюць карэннага палепшэньня, бруд і тратуары не знаходзяцца ў належным становішчы, каналізацыйныя работы надта затягнуліся, вынікі і размеркаваньне жыльлёшчы значна адходзяць ў хаатычным становішчы, не праўдзена належная ініцыятывы на прыкладзеньні ў парадак паркаў і арганізацыі культурнага адпачынку для рабочых, санітарнае становішча гораду ў цэлым застаецца ўсё яшчэ да гэтага часу незадавальняючым.

г) Адным з буйнейшых недахопаў у рабоце гарсавету зьяўляецца слабавата кіраўніцтва і мабілізацыя актыўнасьці членаў гарсавету і ўсёй рабочай масы вакол задач на палепшэньні забясьпечэньня рабочага насельніцтва, на палепшэньні работы рабочае кааперацыі. Гарсавет не забясьпечыў кіраўніцтва работай кааперацыі ў галіне вагатовак сельска-гаспадарчых прадуктаў для забясьпечэньня рабочых Менску. Арганізацыя прыгарадных жыльлёвагадоўных гаспадарак вялікае марудна, што прымаючы актыўны ўдзел у падрыхтоўцы пралетарскіх кадраў для вёскі.

Даручыць Аддзелу Агітацыі Мас. Камп. ЦК і фракцыі ЦВК дэталёва распрацаваць пытаньне аб абслугоўваньні гарсаветамі вёскі і ўнесьці на сакратарыят.

8. Даручыць фракцыі гарсавету распрацаваць на аснове данай пастановы плян вытворчых мерапрыемстваў і ўнесьці на разгляд СНК.

9. Цэнтральным газэтам больш поўна, чым да гэтага часу, і сыстэматычна асьвятляць работу гарадзкога савету.

10. Узмацненьне ваеннай небясьпекі, асабліва становішча Менску патрабуе значнай увагі з боку гарсавету да задач узмацненьня абароназдольнасьці. Гарсавету неабходна аказаць усямерную дапамогу Асоавіяхіму ў разгортваньні яго работы, праяўляць максымальную чуласьць і увагу да запатрабаваньняў Чырвонай арміі, да палепшэньня матар'яльна-бытавых умоў Чырвонай арміі і камандзірскага складу (забясьпячэньне кватэрамі, арганізацыя сталовак, камунальнае абслугоўваньне і санітарна-гігіенічнае абслугоўваньне чырвоаармейцаў). Пытаньне дапамогі Чырвонай арміі, бесьпячэньне ваеннай сувязі рабочых г. Менску з часьцямі Чырвонай арміі, разгортваньне і палепшэньне сувяарыскай работы, павінны заняць вялікае месца ў рабоце гарсавету.

11. Улічваючы выключна значэньне чарговай справаздачна-перавыбарчай кампаніі савету, гарком і ўсёй гарадзкой партыйнай арганізацыі зьвярнуць асаблівую ўвагу пытаньню мабілізацыі рабочых і ўсіх працоўных навакол гэтай важнейшай кампаніі. Гарадзкому савету і гарпартыйным арганізацыям забясьпечыць стопроцэнтную явку рабочых, жолак рабочых і ўсіх працоўных на справаздачна-перавыбарчы сходы гарсавету, разгарнуць шырокую самакрытыку вазу, накіраваць агонь пралетарскай самакрытыкі на больш глыбокае ўскрыцьцё ўсіх недахопаў, бюракратызму і апартуністычных скажэньняў лініі партыі ў практыцы работы асобных аддзелаў гарсавету, забясьпечыць далейшае палепшэньне складу савету, высоўваючы новыя пралетарскія кадры з асобных работных і рабочых-ударнікаў!

Бюро ЦК лічыць, што ў гэтым, гарадзкому савету прыняць усе неабходныя меры да захаваньня паяўнага жыльлёвага фонду, наладзіць поўны вучот і правільнае размеркаваньне жытар, задавальняючы ў першую чаргу рабочых і камандны склад Чырвонай арміі.

4. Гарадзкому савету зьвярнуць асаблівую увагу на выпраўленьне задач па ўзмацненьні і палепшэньні забясьпячэньня рабочых, Чырвонай арміі і ўсіх працоўных Менску прадуктамі харчаваньня і грамадзкім харчаваньнем. Для гэтага неабходна больш актыўна ўдзельнічаць і кіраваць разгортваньнем прыгарадных гаспадарак, канчаткова ўрэгуляваць да пачатку веснавой сяўбы пытаньне аб адводзе зямель для іх арганізацыі, прыняць меры да ўзмацненьня загатовак сельска-гаспадарчых прадуктаў, забясьпечыць далейшае пашырэньне сеткі сталовых на прадпрыемствах і ў горадзе, забясьпечыць скончэньне будаўніцтва новых сталовай і фабрыкі - кухні ў самы кароткі тэрмін з такім разьлікам, каб ахапіць у асноўным усіх рабочых гарадзкой прамысловасьці і транспарту і значную частку членаў сем'яў рабочых грамадзкім харчаваньнем. Зьвярнуць асаблівую ўвагу на палепшэньне якасьці абедаў, на ліквідаваньне чаргі ў сталоўках і палепшэньне абслугоўваньня рабочага спажыўца. Гэта можа быць дасягнута пры тых умовах, калі гарсавет узмоцніць кіраўніцтва ўсёй работай кааперацыі, забясьпечыць выстарчальную дапамогу рабочай кааперацыі і мабілізуе ўвесь савецкі актыў для ажыцьцяўленьня рабочага кантролю над работай кааперацыі.

5. Гарадзкому савету забясьпечыць правядзеньне ў бягучым годзе раду мерапрыемстваў на палепшэньні дабрабыту гораду. Прыняць усе меры да забясьпячэньня бесьперабойнага абслугоўваньня працоўных сьвятлом і водой. Находячы летні сэзон скарыстаць для забрукаваньня прылягаючых да фабрык, заводаў і да чыгуначных станцый вуліц; распрацаваць у бліжэйшы час пытаньне аб пабудове ўдасканаленых брукаў з такім разьлікам, каб з вясны ўжо прыступіць да перабрукаваньня вуліц і тратуараў, устанавіць сталы кантроль над санітарным становішчам гораду, а таксама правесьці рад мерапрыемстваў па забясьпячэньні здаровага і культурнага адпачынку для рабочых: прыступіць да пабудовы парку «культуры і адпачынку», пабудаваць дом адпачынку для рабочых-ударнікаў. Адначасова з гэтым гарадзкому савету разгарнуць работу па плянаваньню гораду такім тэмпам, каб скончыць гэту работу на працягу бліжэйшых 2-х год.

6. Гарсавету не пасьлабляць сваёй увагі да задач культурнага будаўніцтва, прыняць меры да палепшэньня жыльлёвых умоў масавай школы, разгарнуць шырэй школьнае будаўніцтва ў горадзе, забясьпечыць поўнае правядзеньне усягульнага навучаньня ў гэтым годзе, ліквідацыі нязпісьменнасьці сярод рабочых і палепшэньне матар'яльна-бытавых умоў студэнцтва.

Гарсавету забясьпечыць цьвёрдае і пасьлядоўнае правядзеньне ленінскай нацыянальнай палітыкі, прыняць усе захады да ўзмацненьня работы на беларусізацыі апарату і абслугоўваньні на родным мове іншых нацыянальнасьцяй (яўрэяў, рускіх, палякаў, татар, латышоў і інш. нацыянальнасьцяй), ядучы рашучую барацьбу з усякага роду скажэньнямі ленінскай нацыянальнай палітыкі, рашуча змагаючыся в правямі вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекай, а таксама праводзячы рашучую барацьбу з контр-рэвалюцыйным беларускім нацыянал-дэмакратызмам і шавінізмамі розных колераў.

7. Адной з важнейшых задач гарсавету зьяўляецца мабілізацыя савецкага актыву і правядзеньне раду практычных мерапрыемстваў па забясьпячэньні актыўнага ўдзелу гарсавету ў сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі і ўзмацненьні пралетарскага ўплыву на вёску. Лічачы работу гарсавету ў гэтай галіне незадавальняючай, бюро ЦК даручае гарсавету мабілізаваць увагу ўсяго савецкага актыву да задач сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі, шырэй разгарнуць шефскую работу і валеньць зьмест яе. Наладзіць нічыльнейшую сувязь гарсавету з сельскімі саветамі і іншымі арганізацыямі вёскі, дапамагаючы ім у правядзеньні ў жыцьцё рашэньняў 11-ага з'езду Саветаў.

9. Даручыць Аддзелу Арганізацыйна-Інструктарскага ЦК і ЦКК, Аддзелу Кадраў ЦК і ЦКК, Аддзелу Мас. Камп. ЦК і ЦКК, Аддзелу Агітацыі і Прапаганды ЦК і ЦКК, Аддзелу Кіраўніцтва Калгаспамі ЦК і ЦКК, Аддзелу Кіраўніцтва Саўгаспамі ЦК і ЦКК, Аддзелу Кіраўніцтва Нацыянальнымі Рэспубліканскімі Арганізацыямі ЦК і ЦКК, Аддзелу Кіраўніцтва Прафсаюзамі ЦК і ЦКК, Аддзелу Кіраўніцтва Комсамолам ЦК і ЦКК, Аддзелу Кіраўніцтва Піонерскімі Арганізацыямі ЦК і ЦКК, Аддзелу Кіраўніцтва Ваенна-Фізічнымі Арганізацыямі ЦК і ЦКК, Аддзелу Кіраўніцтва Ваенна-Хімічнымі Арганізацыямі ЦК і ЦКК, Аддзелу Кіраўніцтва Ваенна-Марскімі Арганізацыямі ЦК і ЦКК, Аддзелу Кіраўніцтва Ваенна-Лётнымі Арганізацыямі ЦК і ЦКК, Аддзелу Кіраўніцтва Ваенна-Інжынерн

Аб народна-гаспадарчым пляне на 1931 год

ДАКЛАД СТАРШЫНІ СНК СССР—ТАВ. МОЛАТАВА (СКРАБІНА)

I. Пытаньні гаспадарчага будаўніцтва

Таварышы! Кантрольныя лічбы народнай гаспадаркі прыходзіцца разглядаць ужо шосты раз.

Першыя кантрольныя лічбы, як вядома, былі выпрацаваны яшчэ для 1925-26 году. У далейшым ад кантрольных лічбаў на адзін год мы перайшлі ня толькі да выпрацоўкі, але і да ажыцьцяўленьня пяцігадовага пляну народнае гаспадаркі. Зараз, на парозе трэцяга году пяцігодкі, мы падвядзем вынікі першых двух год.

Мне прыдзецца спыніцца толькі на самых асноўных пытаньнях народна-гаспадарчага пляну на 1931 год, толькі на пытаньнях, якія акрэсьліваюць палітычную лінію, бо апрача майго дакладу будзе яшчэ даклад старшыні Дзяржпляну Саюзу — **тав. Куйбышава**, дэталізуючы гаспадарчыя заданьні і задачы на бягучы год.

Да вынікаў першых 2 год пяцігодкі

Пачну з вынікаў першых двух год пяцігодкі. Гэтыя вынікі асабліва важныя, бо на працягу мінулага нэрыяду мы ўпяршыню прыступілі да ажыцьцяўленьня адзінага на рад год, на пяцігодку, пляну народнае гаспадаркі. Гэтыя вынікі зьяўляюцца, з аднаго боку, праверкай нашага плянаваньня, з другога — праверкай сіл, якія мае рабочая клясa, аб магчымасьці ажыцьцяўленьня задач сацыялістычнага будаўніцтва.

І аб выніках першых двух год выканаьня пяцігодкі лепш за ўсё судзіць, параўноўваючы гаспадарчыя заданьні за гэты нэрыяд з фактычнымі іх выкананьнем. У сувязі з гэтым я сыпнюся на чатырох момантах.

Па-першае, **пытаньне аб народным даходзе**. Наводнае пяцігадовага пляну, народны даход за мінулае двухгодзьдзе павінен быў узрасьці на 58,3 млрд. рублёў.

Што маем у сапраўднасьці? У сапраўднасьці-ж за гэты нэрыяд народны даход у сунастаўленым відзе павялічыўся да 59,6 мільярдаў рублёў. Такім чынам, на справе мы маем перавыконьне настаўленых у пяцігадовым пляне заданьняў па прыросьце народнага даходу, які дасягае **106 проц.** пяцігадовага пляну.

Па-другое, **валавая прадукцыя прамысловасьці**. Наводнае пяцігадовага пляну прамысловасьць ВСНГ у першыя два гады пяцігодкі павінна была даць валавой прадукцыі на 29,3 млрд. рублёў. Што мы маем на справе? На справе валавая прадукцыя прамысловасьці ВСНГ за двухгадовы нэрыяд склала **30,5 млрд. рублёў**. Плян выкананы тут у разьмеры 104 проц.

Па-трэцяе **капітальныя ўкладаньні ў асноўныя фонды агрэмаджанага сэктару** (прамысловасьць, транспарт, саўгасы, калгасы і г. д.). Пытаньне аб капітальных укладаньнях мае асаблівае значэньне, бо капітальнымі ўкладаньнямі акрэсьліваецца далейшы рост народнае гаспадаркі, г. зн. далейшы рост валавой прадукцыі прамысловасьці, прытым ня толькі прамысловасьці. Як-жа выконваліся заданьні пяцігодкі па капітальных укладаньнях? Лічбы паказваюць, што замест 12,7 млрд. рублёў, запраектаваных планам, фактычна капітальныя ўкладаньні за двухгадовы нэрыяд дасягнулі **13,8 млрд.** рублёў. Тут мы маем перавыкананьне пяцігадовага пляну, якое дасягае **109 проц. у пяцігодцы.**

Нарэшце, чацьвертае, **дзяржаўны бюджэт**. Пяцігодкай у першыя два гады дзяржаўны бюджэт прадугледжваўся ў суме 17 млрд. рублёў. Ці выкананы гэта заданьне? **Ня толькі выкананы, але і значна перавыкананы.** Бюджэт за мінулае двухгодзьдзе склаў 21 млрд. рублёў, дасягнуўшы **124 проц. па заданьнях пяцігодкі.**

Такія важнейшыя вынікі выкананьня пяцігодкі за першыя два гады. Яны даволі паказальны для характарыстыкі посьпехаў у справе сацыялістычнай рэканструкцыі народнае гаспадаркі. На аснове гэтых посьпехаў, на аснове ўсяго змаганьня рабочай клясы за ажыцьцяўленьне пяцігадовага пляну мы атрымалі вялізарнейшыя зрухі ня толькі непасрэдна ў эканамічным, але і ў сацыяльным разьвіцьці нашай краіны.

Асабліва вялікае значэньне мае тое, што адбылося за мінулы нэрыяд на вёсцы, у найбольш адсталай галіне гаспадаркі. Паварот сялянскіх мас да сацыялізму, паварот серадняка на шлях калектывізацыі зьяўляецца фактам вялізарнага гістарычнага значэньня. Гэты рашаючы для апошняга нэрыяду факт у разьвіцьці нашай краіны стварыў прадпасылкі для пэўнага павароту ў палітыцы савецкай улады. Гэты паварот заключаўся ў тым, што ад палітыкі абмежаваньня капіталістычных (кулацкіх) элемэнтаў на вёсцы мы перайшлі да палітыкі ліквідацыі кулацтва, як класы. Зроблены Кастрычнікай рэвалюцыйны разгром капіталістаў і паменшчыкаў заваршаецца цяпер ліквідацыяй кулацтва як класы на аснове суцэльнай калектывізацыі. Пасьля Кастрычніцкага перавароту — гэта важнейшы крок савецкай улады ўперад. Будаўніцтва сацыялізму на аснове індустрыялізацыі краіны, ліквідацыі кулацтва як класы на базе суцэльнай калектывізацыі — вось тое, што акрэсьлівае палітыку савецкай улады па сучасны нэрыяд. Самы факт, што рабочая клясa з посьпехам ажыцьцяўляе гэту палітыку, кажа аб пераможным прасоўваньні ўперад справы сацыялізму.

Але калі за першыя два гады пяцігодкі мы дабіліся вялізарных посьпехаў, дык побач з гэтым мы ня павінны забываць пра наяўнасьць буйных недахопаў у нашай рабоце. За мінулы гаспадарчы год, а таксама за так званы асобны квартал, які пэрыяўна закончыўся, г. зн. тры апошнія месяцы 1930 году, надрэсьліваюць гэтыя асноўныя недахопы нашай гаспадарчай работы. Даволі паказаць, што кантрольныя лічбы на 1929-30 год, а таксама за асобны квартал на прыросьце прамысловай прадукцыі далёка ня цалкам выкананы, ня поўнасьцю выкананым а таксама заданьне па зьніжэньні сабекошту.

Недавыкананьне вытворчай праграмы ў прамысловасьці, заданьняў па зьніжэньні сабекошту ў другім годзе пяцігодкі, а таксама ў асобным квартале 1930 году, здарылася, ня гледзячы на вялізарнейшы рост творчай актыўнасьці рабочых мас, ня гледзячы на ўсё ўзрастаючую арганізаванасьць удзелу рабочых у гаспадарчым будаўніцтве. Прычынай гэтага трэба прызнаць **недахопы гаспадарчага кіраўніцтва, іменна невыстарчальнае ўменьне сапраўды заўсёды быць на чале рабочых мас**, апіраюцца ў справе будаўніцтва сацыялізму на бесьперапынна ўзрастаючую актыўнасьць пралетарыяту і ўсіх працоўных. Праўда, заданьне пяцігодкі на прыросьце прамысловай прадукцыі для 1929-30 году на 21 проц. мы ня толькі выканалі, але і перавыканалі, дабіўшыся прыросту прамысловай прадукцыі за гэты год на 25 проц., але заданьні на пляне кантрольных лічбаў як у гэтай галіне, так і на радзе іншых паказальнікаў, аказаліся ўсё-ж ня выкананымі. Не дапусьціць гэтага ў бягучым годзе — наш первэйны абавязак.

2. Кантрольныя лічбы на 1931 год

Перайду да задач трэцяга году пяцігодкі, да кантрольных лічбаў на 1931 год.

1931 год — рашаючы у справе ажыцьцяўленьня пяцігодкі за чатыры гады.

Каб больш выразна прадставіць гаспадарчы мэхэнак 1931 году, мне прыдзецца на радзе асноўных элемэнтаў правесьці параўнаньне народна-гаспадарчага пляну за бягучы год з рэзультатамі папярэдняга году. З характарыстыкі-ж росту народнае гаспадаркі ў цэлым сыпнюся толькі на двух пытаньнях: на народным даходзе і дзяржаўным бюджэце.

Аб народным даходзе

Якая-ж сума прыросту народнага даходу прадугледжваецца намі ў 1931 годзе, які прырост праектуецца пянтам, якім адпаведным даным за мінулы год? Адпаведныя даныя паказваюць, што за 1930 **год народны даход дасягнуў сумы ў 35 мільярдаў руб.** Лічба даволі вялікая. Аднак, у 1931 годзе народны даход наводнае пляну павінен будзе рыяд з 1930 году на 1913 год, г. зн., прыкладна тую-ж лічбу, якая меркавалася для апошняга году пяцігодкі.

У параўнаньні з мінулым годам прырост народнага даходу дае павялічэньне на 39 проц. (да рэчы адзначу, што дагэтуль у нашых афіцыйных пастановах мы з-за асьцярожнасьці зварачаліся да формулы «ня менш 35 проц.»).

Цікава параўнаць гэтую лічбу з даными прыросту народнага даходу ў даваеннымі час. Аказваецца за пэрыяд з 1900 году па 1913 год, г. зн. **за цэлыя 13 год, прырост** народнага даходу ў царскай Расіі **дасягнуў 39 проц., або ў сярэднім 2,6 проц. за год.** Значыць, той процант прыросту народнага даходу, які ў царскай Расіі зьяўляся рэзультатам разьвіцьця народнае гаспадаркі за 13 год, у наш час павінен адбыцца на **працягу 1 году.** Адно гэта параўнаньне паказвае, на які вялікі шлях выйшла наша краіна.

Але гэты мальнак варта дапоўніць яшчэ адзнай высказ. Параўнаем прырост народнага даходу СССР з прыростам народнага даходу ў капіталістычных краінах. Адпаведныя даныя адносна **ПАЗШ, Англіі, Нямеччыны за апошнія пяць год (1925-29 гады)** паказваюць, што ў гэтых краінах у сярэднім штогодны прырост народнага даходу складае **ад 3 да 6 проц.** Гэта параўнаньне гаворыць яўна не на карысьць капіталізму, **а на карысьць СССР.**

Рост дзяржбюджэту

Перайду да паказальнікаў росту нашага дзяржбюджэту.

Кожны год дзяржаўны бюджэт СССР значна вырастае. У гэтым годзе гэта ўзрастанне павінна быць асабліва вялікім. Сьвердлоўская ў 1929 годзе сэсія ЦВК дала бюджэт на 1929-30 год вызначыла ў 19 мільярда рублёў. Цяпер СНК прапануе на ваша заканадаўчае абмеркаваньне бюджэт у разьмерах **21,7 мільярда рублёў**, г. зн., амаль у два разы больш, чым у 1929 годзе. Правда, з часу апошняй сэсіі ЦВК, дзякуючы рабоце, раней гэтай партыяй і савецкай уладай у галіне гаспадарчага будаўніцтва, спачатку расьцвітаны дзяржбюджэт на працягу году значна вырас і склаў фактычна 12 мільярды рублёў.

Аднак, і для 1931 году мы ўрахам

Капітальныя ўкладаньні ў абагулены сэктар

Значэньне гэтых даных зробіцца асабліва выразным, калі прааналізаваць кірунак разьвіцьця народнае гаспадаркі СССР і ўстанавіць, у якой меры рост народнага даходу забясьпечвае ажыцьцяўленьне асноўнай задачы — задачы індустрыялізацыі краіны.

Адказам на такое пытаньне служаць перш за ўсё даныя аб капітальных укладаньнях. У 1931 годзе мы будзем мець тут новы гіганцкі крок уперад. У параўнаньні з мінулым годам, калі капітальныя ўкладаньні ў «абагулены сэктар» (прамысловасьць, транспарт, зельская гаспадарка) складалі 9.771 мільён рублёў, дык капітальныя ўкладаньні гэтага году, якія складаюць суму 17.017 мільёнаў рублёў, даюць прырост у 74 проц. Гэты процант прыросту вышэй за процанты мінулых год. Ільвіная доля капітальных укладаньняў зараз таксама ідзе па лініі прамысловасьці. Усяго ў прамысловасьць разам з электрастанцыямі ў трэцім годзе пяцігодкі ўкладваецца 7.465 мільёнаў рублёў.

Гаві-ж узяць толькі ўкладаньні ў капітальнае будаўніцтва прамысловасьці, што плянуецца ВСНГ, дык аказацца, што з агульнай сумы гэтых укладаньняў (у пяць з паловай мільярдаў рублёў) больш, чым 5 млрд. ідзе на капітальнае будаўніцтва (па групе цяжкай прамысловасьці). Група А. На лёгкую індустрыю, аграмна укладаньняў па лініі ВСНГ, ідуць укладаньні таксама па лініі НК Забесьпячэньня.

Асноўныя ўкладаньні па групе А. ідуць на капітальнае будаўніцтва чорнай металюргіі, на мэталапрадукцыю, апалу, хіміі, буйнейшых матар'ялах і г. д. Капітальныя ж укладаньні ў электрабудаўніцтва плянуецца з 450 да 900 мільёнаў руб., г. зн., узрастаюць у два разы. Гэтыя лічбы яркі характарызуюць асноўны кірунак матар'яльных рэсурсаў, які праводзіцца нашай дзяржавай.

Народна-гаспадарчы плян на 1931 год прадугледжвае значэньне ўкладаных сродкаў для хутчэйшага росту ў ход

лектывізаваных сялянскіх гаспадарак параўнаць з агульнай колькасьцю сельскіх гаспадарак у такіх краінах як Нямеччына і Францыя.

Адпаведныя статыстычныя матар'ялы паказваюць: у Нямеччыне наводнае даных перапісу 1925 году ўсіх сельскіх гаспадарак было 5.096 тыс., у Францыі паводле анкетнага перапісу 1928 году ўсіх сельскіх гаспадарак было 5.495 тысяч., г. зн., што **да пачатку 1931 году ў нашай краіне было калектывізавана больш сялянскіх гаспадарак, чым іх налічваецца ў любой з паказаных краін, г. зн., Нямеччыне і Францыі.**

Посьпехі калгаснага руху рэзка зьмянілі становішча на вёсцы. Да пачатку ажыцьцяўленьня пяцігодкі ў калгасах была аб'ядналася толькі вельмі незначная частка сялянскіх гаспадарак. Доля валавой таварнай прадукцыі калгасаў у агульнай прадукцыі сельскае гаспадаркі была ў той час дзяначтная. Пераважнае значэньне ў сельскай гаспадарцы мела дробная сялянская гаспадарка. У вёсцы яшчэ працягваўся рост капіталістычных элемэнтаў—кулацтва.

За апошнія паўтара гады адбыліся карэнныя зьмены ў разьвіцьці сельскае гаспадаркі. У сучасны момант рост капіталістычных элемэнтаў ня толькі спыніўся, але **іх удзельная вага ў народнай гаспадарцы зьнижаецца з месяца ў месяц.** Гэты пункт адбываецца такім чынам, што ні аб якім павялічэньні долі капіталістычных элемэнтаў у нашай народнай гаспадарцы, ні аб якіх падзеях на адрадзэньне іх ранейшай гаспадарчай сілы ня можа быць і гутаркі. Зьмяншэньне долі капіталістычных элемэнтаў у народнай гаспадарцы адбываецца побач з магутным ростам сацыялістычных элемэнтаў ня толькі ў горадзе, але і на вёсцы, адначасова з усё большым захопам калгасным рухам найнижэйшых мас сялянства. Пераход на шлях суцэльнае калектывізацыі ўсе новых, і пры тым буйнейшых раёнаў краіны, вядзе ня толькі да сапраўднага ўадыму сельскае гаспадаркі і асноўных мас сялянства, але кладзецца магільнай плітой на рэшткі капіталізму, якія гінуць пад дужкім поступам мільённых мас.

Ня гледзячы на дапушчаныя ў мінулым годзе ў радзе раёнаў буйнейшыя памылкі ў калгасным будаўніцтве, ня гледзячы на тое, што антысавецкіяе нерагібы, якія тут былі, адыгралі сваю адмоўную ролю ў другой палове 1930 г., пачаўся ўжо новы прыліў сялян-беднякоў і сераднякоў у калгасы. Дзякуючы сваячасоваму выпрацаваньню партыяй мэтных месца нерагібу, новы прыліў у калгасы набывае зараз усё больш шырокі размах.

Таму ў **народна-гаспадарчым пляне на 1931 год прадугледжана аб'яднаньне ў калгасах ня менш паловы ўсіх сялянскіх гаспадарак.** У адносінах-жа такіх буйнейшых збожжавых раёнаў, як Паўночны Каўказ, Украіна (стэп), **Ніжняе Паволожжа, Сярэдняе Паволожжа, мы разьлічваем у бягучым годзе на завяршэньне, у адносным, на справе суцэльнай калектывізацыі гэтых раёнаў.** Ажыцьцяўленьне гэтай задачы будзе самым важным момантам у росьце сацыялістычных элемэнтаў нашае гаспадаркі на 1931 год. Ажыцьцяўленьне гэтай задачы, побач з іншымі важнейшымі задачамі трэцяга году пяцігодкі, дазволіць завяршыць набудову фундамэнту сацыялістычнай эканомікі ў Савецкім Саюзе. З гэтага трэба зрабіць той вывад, што **ажыцьцяўленьне пастаўленых народна-гаспадарчым плянам на 1931 год задач будзе мець сусьветна-гістарычнае значэньне для справы сацыялізму.**

Няма неабходнасьці падрабязна спыняцца на тым, як рост нашае гаспадаркі непасрэдна адбіваецца на паляпшэньні матар'яльных умоў жыцьця народных мас. Адпаведных даных апублікавана нямала. Асноўныя з іх досыць добра ведомы кожнаму рабочаму і шырокім пластам сялянства. Лепшым паказальнікам таго, што посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва блізкі і зразумелы для рабочых і сялянскіх мас, зьяўляецца рост актыўнага ўдзелу мас у сацыялістычным будаўніцтве на нашых фабрыках і заводах, а таксама ў саўгасах і калгасах, што выяўляецца перш за ўсё ў паўхільным уздыме сацпаборніцтва і ўдарніцтва. У мінулым годзе сацпаборніцтва пачало перарастаць у новыя вышэйшыя формы, формы прыняцьця сустрэчнага прамфінпляну зьнізу, што на практыцы азначае добраахвотнае прыняцьце і ажыцьцяўленьне на справе павялічаных супроць устаноўленых дзяржаўнымі органамі вытворчых заданьняў. Да пачатку 1931 году больш паловы рабочых і работніц ужо ўдзельнічала ў рады ўдарнікаў.

Сацпаборніцтва і ўдарніцтва таксама расьце ў саўгасах і ўсё больш укарэньваецца ў калгасах. Усё гэта ня толькі характарызуе велічыню посьпехаў нашага гаспадарчага будаўніцтва, але і паказвае на тое, які ўплыў маюць нашы посьпехі на становішча рабочых мас і калгаснікаў у вёсцы.

З паасобных яркіх паказальнікаў палепшэньня становішча рабочых мас трэба перш за ўсё ўказаць, як галоўнейшае, **на ліквідацыю беспрацоўя.** Яшчэ год таму назад у нас было звыш мільёна беспрацоўных, цяпер-жа **ў першай краіне беспрацоўе ў асноўным ліквідавана.** Больш таго, **у радзе раёнаў адчуваецца значны недахват у рабочай сіле, у тым ліку недахват у некваліфікаваных рабочых.**

Другім буйнейшым паказальнікам палепшэньня становішча рабочых мас зьяўляецца **пасьпяховае правядзэньне сямігадзіннага рабочага дня. У 1931 г. на сямігадзінны рабочы дзень будуць пераведзены ня толькі ўсе рабочыя чыгуначнага транспарту, але каля 9/10 рабочых нашай прамысловасьці.**

Аб росьце зарплаты рабочых і служачых

З году ў год савецкая ўлада пляменна праводзіць узьняцьце зарплаты. Гэта будзе мець месца таксама ў 1931 г. Павышаецца зарплата **ў прамысловасьці (на 6 проц.), на транспарце (8 проц.).**

Побач з падвышаньнем зарплаты пікааплачаных колаў рабочых, асабліва значэньне набывае ўзьняцьце зарплаты рашаючых для вытворчасьці груп кваліфікаваных рабочых, а таксама служачых. Варта толькі ўказаць на той факт, што ўзьняцьце зарплаты праводзіцца ў нас адначасова з увядзеньнем сямігадзіннага рабочага дня і ўстанаўленьнем пяцідзённага тыдню (бесьперапынка), рэгулярным днём адпачынку для рабочых і служачых кожны пяты дзень, каб працілегласьць умоў жыцьця працоўных мас у СССР і капіталістычных краінах была выкрыта з усёй паўнатой.

Што датычыць выпадкаў затрыманьня выдачы зарплаты, якія мелі месца ў апошні час, дык **падобныя зьявішчы павінны быць безадкладна ліквідаваны.**

Ужо ў 1930 г. па пасёўных плошчах калгасаў мы выканалі больш чым падвойнае заданьне ўсяго пяцігадовага пляну. У 1931 г. мы ставім задачай прыкладна падвоіць нашы дасягненьні мінулага году. Няма чаго гаварыць, што гэта будзе мець вялізарнае значэньне для забясьпячэньня выкананьня пяцігодкі за чатыры гады.

Няма неабходнасьці спыняцца на іншых усім вядомых паказальніках палепшэньня матар'яльных і культурных умоў жыцьця рабочых мас, досыць будзе іх проста пералічыць.

Сёды адносіцца: **рост жыльлёвага будаўніцтва для рабочых, далейшае павялічэньне спэцыяльнага фонду па палепшэньні быту рабочых, далейшае разгортваньне лячэньня рабочых у санаторыях, курортах і г. д.** Апрача гэтага, для рабочых і служачых мае вялізарнае значэньне факт, што **фонд спэцыяльнага страхаваньня дасягне ў гэтым годзе вялізарнай лічбы 2.138 міл. рублёў, што перавышае цыфру гэтага фонду, якая намячалася для пятага году пяцігодкі.**

У адносінах вёскі, і асабліва ў адносінах вясковай беднаты, савецкая ўлада праводзіць з году ў год усе больш узрастаючую дзяржаўную дапамогу сялянскай гаспадарцы. У апошні нэрыяд гэта дапамога і розная роду ільготы накіроўваецца ў першую чаргу для падтрыманьня калгасаў. Усе гэта ў сваю чаргу ўжо адбілася на росьце пасёўных плошчаў, павышэньні ўраджайнасьці сялянскіх гаспадарак і перш за ўсё у калгасах. Апошні сельска-гаспадарчы год у гэтых адносінах быў асабліва паказальным.

Нарэшце вялізарнае эканамічнае і палітычнае значэньне мае палітыка цэн савецкае ўлады. Пры росьце даходаў гарадзкіх і вясковых мас пасьлядоўнае правядзэньне такой палітыкі цэн, якая (палітыка) выключае павышэньне цэн на прамтавары і сельгаспрадукты, дзяржаўна-кааперацыйны гандаль мае першачарговае значэньне. У 1931 г. гэты факт павінен знайсьці асабліва яркі адбітак з прычыны таго, што вытворства прамтавараў шырокага спажываньня, а таксама ўвесь раздробны аварот, значна ўзрасьце. Дапушчанае савецкай дзяржавай часткове павышэньне цэн для буржуазных элемэнтаў па некаторых прамтаварах ажыцьцяўляецца без якога-б там ні было парушэньня ўстаноўленых норм забясьпячэньня для працоўных, і, вядома, з асноўнай лініяй савецкае ўлады ў гэтым пытаньні супярэчнасьцяй няма.

Дарэчы трэба адзначыць, што крыкі буржуазнай прэсы наконт падрыву курсу нашага рубля, прадстаўляюць сабою ні больш і нішчо, як недарэчныя выдумкі і бэшэ яўна міма цэлі. Гэтыя выдумкі разьбіваюцца ўшчэнт аб бясспрэчныя факты і перш за ўсё аб той факт, што цэны на пераважную масу таварэў шырокага спажываньня рэгулююцца дзяржавай, якая не дапушчае якога-небудзь павышэньня гэтых цэн, у радзе-ж выпадкаў зьніжае гэтыя цэны.

Роля-ж прыватнага рынку, спэкуляцыя прыватніка ў нашай краіне цяпер няўхільна падае. Тым ня менш, мы павінны і далей ёсьці барацьбу за замацаваньне савецкага рубля.

Усе прыведзеныя факты, характарызуючы няўхільнае палепшэньне матар'яльных і культурных умоў жыцьця рабочых і сялянскіх мас, даказваюць разам з тым зрабіць наступны вывад: посьпехі сацыялізму, растучы ўплыў іх на становішча народных мас стваракоць прадпасылкі для новага гіганцкага росту актыўнасьці мас у сацыялістычным будаўніцтве, тым самым забясьпечваючы яшчэ больш буйныя посьпехі гэтага будаўніцтва ў далейшым.

3. Нашы задачы на баявых вучастках

Галоўнай і асноўнай задачай трэцяга году пяцігодкі зьяўляецца выкананьне народна-гаспадарчага пляну ў тым аб'ёме, у якім ён будзе прыняты партыяй і савецкай уладай. Мы ня толькі павінны дабіцца поўнага ажыцьцяўленьня пастаўленых у гэтым пляне задач, але дабіваца яго перавыкананьня асабліва па важнейшых вучастках. Бясспрэчна таксама, што **ажыцьцяўленьне заданьня па ахвату калгасным рухам ня менш паловы сялянскіх гаспадарак зьяўляецца адным з самых асноўных задач 1931 г.**

Будзем памятаць аб тым, што выкананьне гэтых заданьняў будзе азначаць, што мы напэўна ажыцьцявім на практыцы лёзунг «Пяцігодка—за чатыры гады».

Пад сьцягам «Пяцігодка—за чатыры гады» мы павінны і зараз будаваць нашы рады, павінны арганізаваць масы для пераможнага ажыцьцяўленьня пяцігодкі.

Пераходзячы да асобных канкрэтных задач, пакажу толькі на самыя баявыя вучасткі гаспадарчага фронту 1931 г.

Вось гэтыя вучасткі:

1) **Апал і мэталь. Ад пасьпяховага выкананьня праграмы на апале гэтага году залежыць ажыцьцяўленьне вытворчай праграмы ў цэлым і перш за ўсё ўсёй праграмы па мэталі.** Цяпер, у сувязі з індустрыялізацыяй, якая разгортваецца ва ўсёй краіне, патрэба ў павялічанай вытворчасьці мэталю асабліва хутка расьце. Скарачэньне запасаў апалу і разам з тым вялізарны рост патрэбнасьці ў апале стварацьць бязумоўнае выкананьне ў тэрмін праграмы на апале нашай першачарговай задачай. Побач з гэтым неабходна максымальная эканомія выдаткаваньня апалу, а таксама жорсткая эканомія ў выдаткаваньні мэталю.

2) **Транспарт.** У 1931 г. прадстаіць вялізарнае павялічэньне работы ўсіх відаў транспарту і перш за ўсё чыгуначнага і воднага. У адпаведнасьці з магутным ростам прадукцыі, **грузазварот павінен узрасьці за адзін год амаль на 50 проц.** Побач з павялічэньнем грузавых перавозак значна павялічваецца і пасажырскі рух. Між тым сучаснае становішча на транспарце нельга прызнаць задавальняючым. Неабходна ва што-б там ні стала дабіцца рашучага пералому ў рабоце нашага транспарту, забясьпечыць яму належнае падтрыманьне з боку ўсіх арганізацый і рабочай клясы і правесьці сапраўднае палепшэньне арганізацыйнай справы ў гэтай адказнейшай галіне народнае гаспадаркі. У транспарце, таксама як і ў апаławай прамысловасьці, нельга ніводнага дня мірыцца з сучасным становішчам. Трэба дабіцца ў найкарацейшы тэрмін рашучага зруху ў гэтай і другой справе.

3) **Веснавая пасэўная кампанія.** У гэтым годзе мы будзем мець другую бальшавіцкую сяўбу. Падрыхтоўка да яе ўжо пачалася. Як і ў мінулым годзе веснавая пасэўная кампанія мае ня толькі вялізарнае эканамічнае, але і вялікае палітычнае значэньне. Падрыхтоўку да веснавой кампаніі ўжо цяпер трэба зьвязаць з падрыхтоўкай да ўборачнай кампаніі. Мы больш ці менш ужо навучыліся арганізоўваць пасэўныя кампаніі. І калі зараз мы ня будзем траціць часу, дык бязумоўна можам здавальняюча падрыхтавацца да веснавой сяўбы. Але значна вялікія труднасьці паўстануць перад намі пры правядзеньні ўборачнай кампаніі. Іменна з прычыны недахопаў ўборачнае кампаніі мінулага году мы няпоўнасьцю забясьпечылі сабе вынікі надвычай добрага ўраджаю, а гэта павінна нас навучыць таму, як трэба рыхтавацца да ўборачнай кампаніі. Ва ўсё ўзрастаючай буйной сельска-гаспадарчай вытворчасьці саўгасаў і калгасаў механічныя сродкі і машыны набываюць вялізарнейшае значэньне. Гэта ўжо вынялася на вопыце пасэўнай і ўборачнай кампаніі. Але справа ня толькі ў свячасовым і поўным разгортваньні вырабу трактараў, камбайнаў і другіх уборачных машын, вырабу неабходных для іх запасных частак, але таксама і ў правільнай арганізацыі тэй ці іншай справы ў цэлым. Час у нас для гэтага цяпер ёсьць, ня трэба толькі траціць ні аднаго вельмі каштоўнага дня ў правядзеньні неабходнай падрыхтоўкі да вясны і да ўборкі.

4) **Забесьпячэньне.** Пытаньне аб забесьпячэньні рабочых непасрэдна зьвязана з другімі задачамі народна-гаспадарчага пляну. Да справы забесьпячэньня мы павінны зараз падыйсьці як да адной з важнейшых умоў сацыялістычнай вытворчасьці. У нас ёсьць добрыя прадпасылкі для далейшага паляпшэньня забесьпячэньня рабочых у 1931 годзе. Гэта відаць ужо з таго, што фонд прамтавараў для шырокага спажываньня з 11 з паловай мільярдаў руб. у 1930 г. ўзрастае да 14,6 мільярдаў руб. у 1931 г., што разам з ростам фонду сельска-гаспадарчых тавараў павінна павялічыць раздробны аварот на 25-30% у параўнаньні з мінулым годам. Лічбы гавораць самі за сябе.

Два словы аб становішчы з важнейшым прадуктам харчаваньня — хлебам. Партыя і савецкая ўлада, на аснове посьпехаў саўгаснага і калгаснага будаўніцтва, дабілася ўжо вырашэньня ў асноўным збожжавай праблемы. Ход збожжазагатовак сьведчыць аб тым, што хлебам наша краіна будзе забясьпечана. Калі на студзень 1930 г. мы заготавілі 594 млн. пудоў, дык на студзень 1931 г. мы змаглі заготовіць ужо 1.252 млн. пудоў. Такім чынам, у параўнаньні са спрыяючым агульным ходам загатовак мінулага году, мы маем ў гэтым годзе павялічэньне загатоўленага збожжа на 359 млн. пудоў. Упяршыню сапраўды значная доля гэтых загатовак прыпадае на саўгасы і калгасы (каля паўмільярда пудоў). Нельга не падкрэсьліць посьпехаў загатоўчай работы МТС. **Гадавое заданьне па здачы хлеба дзяржаве МТС выканалі ўжо на 122 проц.** У гэтым годзе мы папырылі экспарт збожжа, што мае вялікае значэньне для ўвозу неабходных нам машын, у прыватнасьці трактараў і камбайнаў. Аднак плян збожжазагатовак яшчэ ня поўнасьцю выкананы, наша задача давесьці яго выкананьне да канца.

Растуць загатоўкі па такіх важнейшых для задавальненьня патрэбнасьці шырокіх мас сельска-гаспадарчых прадуктах, як бавоўна і буракі. **Загатоўкі бавоўны да пачатку 1931 г. ўжо перавысілі загатоўкі ўсяго папярэдняга году.** Ня гледзячы на гэта, неабходна ўсё-ж весьці далейшую самую ўпартую барацьбу за выкананьне пляну загатовак бавоўны. Моцна ўзрасьлі ў параўнаньні з мінулым годам загатоўкі бураку-**проць загатоўленых у мінулым цукровых буракоў у колькасьці тыс. тон, у гэтым годзе мы заг ўжо 13.805 тыс. тон. Такім чынам тоўкі цукровых буракоў ў бягуч дзе ў два з лішнім разы перавы загатоўкі папярэдняга году.**

Разам з тым мы ня можам яшчэ пасьцю задаволіць усё ўзрастаючэ трэбнасьці ў прадуктах жывёлага Калі мы ўжо пасьпяхова ў асн вырашылі збожжавую праблему, гэтага яшчэ нельга сказаць аб пра жывёлагадоўлі. Недахоп жывёла чых прадуктаў (мяса, масла і м будзе яшчэ даволі сур'ёзна адчу ў працягу некаторага часу. Але дзеньня ў 1930 г. і намечаныя на мерапрыемствы ў гэтай галіне а нечваюць рашучы зрух таксама і тай справе. Гэта відаць хоць-бы з пашэньня росту пагалоўя скаціны гасах павялічыцца яшчэ больш, 1930 г. Колькасьць **буйное рагата вёлы ў саўгасах з 753 тыс. шт. у ўжо да вясны 1931 г. узрастае да тыс.; колькасьць сьвіней ў саўгас вялічваецца з 160 тыс. да 1.690 тыс колькасьць авечак павінна ўзрас 2 з паловай мільёнаў шт. да 5 м** восені-ж 1931 г. пагалоўе жывёлы гасах павялічыцца яшчэ больш шым друку ўжо адзначалася, шт **гасы ўсесаюзных жывёлагадоўчых таў да канца 1931 г. будуць займа рыторыю агульнай плошчай у 54 гэкт., г. зн. значна больш усёй т рыі такой дзяржавы, як Нямеччы як Італія, Аўстрыя і Данія, узяты зам.** Разам з тым пачынае хутка р вацца і жывёлагадоўчая справа гасах. Адначасова задачы паляпш забесьпячэньня жывёлагадоўчымі дуктамі патрабуюць далейшых м паляпшэньні справы загатовак прадуктаў як у сацыялістычным ры, так і ў адзіначасобнай сялянска падарцы.

У трэцім годзе пяцігодкі з асаб рашучасьцю і энэргіяй павінна настаўлена і вырашана пытаньне арганізацыі забесьпячэньня. Нар савецкі ўрад прыняў двойнасы бесьпячальных органаў на мясе, піне ды і ўсю арганізацыю заб чэньня спажывецкай кааперацыі **вальняючай.** Між тым ад забесьпяч залежыць многае пры выкананьні народна-гаспадарчага пляну. Таму **ча кіраўнага паляпшэньня работ апэрацыйна-забесьпячальных органа дача неаспабнай бязьлітоснай бар з бюракратызмам у гэтых органах, і жучы ўжо аб бязумоўным выка ваньні шкодніцкіх элемэнтаў, па быць пастаўлена перад рабочай кл як адна з баявых задач бягучага** гаспадарчага пляну.

5) **Кадры.** Калі партыя ўжо да сур'ёзнага зруху ў справе арган і падрыхтоўкі новых тэхнічных ка дык зараз перад намі стала са рэтрасьцю праблема рабочых кадр

Шпаркі тэмп індустрыялізацыі ны, размах будаўніцтва, калгасны ня толькі прывялі да ліквідацыі бе цоўя, але востра ўжо ў 1930 г. на лі пытаньне аб недахваце рабоче ў радзе раёнаў. У 1931 г. колькасьць рабочых і служачых на ўсіх галіна шае гаспадаркі і кіраўніцтва ўзр да 2 з лішнім мільёнаў. Адзначае ў мінулым годзе ў нашы прадпр ствы ўлілося таксама каля 2-х мл вых рабочых і служачых. Такі росту так званае пасёмнае працы (на жаль яшчэ ўжываць такія слов «наёмная праца» хоць гэта і мал дыходзіць да нашых сучасных ум

Такі вялізарны непарыўны п новых рабочых і служачых патрэб наведнага разгортваньня масавай ізацыйнай і палітыка-выхаваўчай боты партыі, прафсаюзаў, каап усіх дзяржорганаў. Недахопы тут яшчэ вельмі вялікія, яны далі сп чуваць яшчэ ў мінулым годзе ў с з узмацненьнем цякучасьці на пра емствах. У 1931 г. трэба абавязк біцца лепшай арганізацыі ўсёй справы.

У сувязі з гэтым трэба больш ра паставіць пытаньне аб механі Справа мэханізацыі мае простым сіны і да сельскае гаспадаркі, і пр ловасьці, і транспарту, і будаў Мэханізацыя ны апярэдзіла зям дала вялікія вынікі. У 1931 г. мы дзім у сельскую гаспадарку новыя тары з агульнай магутнасьцю да тыс. конскіх сіл, значна павял колькасьць складаных уборачных машын (камбайнаў, малатарань). У гуначным транспарце вялізарнае чэньне для палепшэньня справы ло пытаньне аб аўтасэпны. Пры б ніцтве, асабліва пры буйных р без усямернага разьвіцьця мэхані работ мы не забясьпечым патра нам тэмпаў. Пры нагрузачна-разг ных работах, лесапрацоўках і г. ханізацыя таксама мае вялізарн значэньне. Нарэшце разьвіцьцё галін прамысловасьці, як вугаль, руда і г. д. ва многіх выпадках п ўпярэдзе ў мэханізацы

ПА МЕНСКУ СПРАВАЗДАЧНА-ПЕРАВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ ПРАХОДЗІЦЬ НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧА

Менскі гарсавет ня стаў на чале ўзросшай актыўнасьці рабочай клясы, не разгарнуў работы па мабілізацыі пралетарскіх мас вакол асноўных задач сацыялістычнага будаўніцтва

НЕАДКЛАДНА ЛІКВІДАВАЦЬ ПРАРЫЎ. РАБОТУ ГАРСАВЕТУ—ПАД АГОНЬ БАЛЬШАВІЦКАЙ САМАКРЫТЫКІ.—БЯЗЬЛІТАСНА УДАРЫЦЬ ПА АПАРТУНІСТЫЧНАЙ ПРАКТЫЦЫ. ПАВЫСІЦЬ РОЛЮ САВЕТУ, ЯК ПРАВАДНІКА ГЕНЭРАЛЬНАЙ ЛІНІІ ПАРТЫІ—ВАЖНЕЙШАЯ ЗАДАЧА ПЕРАВЫБАРАЎ

Нацыянальнае пытаньне „выпала" з справаздачы гарсавету

Нацыянал-дэмакрат Пічэта і дагэтуль зьяўляецца... дэпутатам гарсавету

Пасьля сьнежаньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) а асаблівай выразнасьцю падкрэсьлівае задачу, каб пры сучасных перавыбарах саветаў была шырока разгорнута «праверка правядзеньня і далейшага разьвіцьця справы ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі, умацненьня інтэрнацыянальнага адзінства, пралетарскай салідарнасьці і супраціўпоўпіцтва ўсіх народаў СССР і разьвіцьця іх нацыянальных па форме, пралетарскіх па зьмесьце культур».

Вялікае значэньне мае гэта пастанова для БССР, як нацыянальнай рэспублікі, асабліва пры правядзеньні перавыбараў у такіх буйных пралетарскіх цэнтрах, як Менск, Віцебск, Гомель. Вынікі работ гарсаветаў гэтых гарадоў павінны адлюстраваць тыя вялізарныя посьпехі у галіне ажыцьцяўленьня на практыцы ленінскай нацыянальнай палітыкі, якія дасягнуты гэтымі гарсаветамі за справаздачны перыяд.

Калі з гэтага пункту погляду падыйсьці да друкаванай справаздачы Менскага гарсавету, дык з самага пачатку узнаўленьня з ёю кідаецца ў вочы амаль поўная адсутнасьць якіх-небудзь канкрэтных матар'ялаў па гэтым пытаньні. Нельга-ж лічыць адказам на пытаньне аб тым, як ажыцьцяўляў гарсавет нацыянальную палітыку, адны толькі лічбы аб колькасьці школ чатырохгодак, семігодак, вечорніх і прафесыянальных школ, пацвердку вучняў гэтых школ і некаторыя лічбы аб ліквідацыі нянісьменнасьці.

Наступленьне сацыялізму па ўсім фронце і зьвязанае з гэтым абвастрэньне клясавай барацьбы выклікае ажыцьцяўленьне шавінізму розных колераў. Вы пукаеце ў справаздачы адказу, якую работу праводзіў Менскі гарсавет па барацьбе з вялікадзяржаўным шавінізмам, як найбольш небясьпечным на даным этапе. Вядома, што вялікадзяржаўны шавінізм мае апору ў бюракратычных рэшках, якія захаваліся ў дзяржаўным апараце. «Ва ўмовах Беларусі, дзе гарады зьяўляюцца ў значнай сваёй частцы рэгіёнамі... у гэтых умовах вялікадзяржаўны шавінізм мае асабліва спрыяючую глебу для свайго існаваньня». (З пастановы кастрычніцкага пленуму ЦК і ЦКК).

Далей таксама добра вядома, што побач з вялікадзяржаўным шавінізмам значна актызізаваўся беларускі нацыянал - дэмакратызм. У нашым друку даводзілася дзейнасьць выкрытай органамі ДПУ Беларусі - інтэлігенцкай групы контр - рэвалюцыйных нац.-дэмакратаў, якія мелі сур'ёзны ўплыў на лінію раду савецкіх установ (органаў асьветы, земельных і іншых), дзе яны праводзілі нацдэмаўскую практыку.

Дарэмна шукаць адказаў у справаздачы на пытаньне, што зрабіў Менскі гарсавет на барацьбе з праявамі вялікадзяржаўнага шавінізму, як з галоўнай небясьпекай, і з контр - рэвалюцыйнымі нацыянал - дэмакратамі (па ачыстцы савецкіх установаў ад контр - рэвалюцыйных нацдэмаў і іх прыхільнікаў) і шавіністамі іншых колераў.

Па гэтых пытаньнях няма амаль ні аднаго радка ў справаздачы гарсавету, якая займае больш за 100 друкаваных старонак. Як быццам гэтыя пытаньні ня маюць ніякага дачыненьня да дзейнасьці Менгарсавету.

Больш таго, аказваецца, што найрыклад, Пічэта, які выключан са складу ЦВК БССР у сувязі з выкрыцьцём контррэвалюцыйнай дзейнасьці нацдэмаў, пакуль што застаецца членам Менгарсавету.

У наказе цяперашняму складу гарсавету гаворыцца, што «савет павінен яшчэ больш разгарнуць работу на беларусізацыі сваіх устаноў». Мы пытаемся: што зроблена гарсаветам для выкананьня гэтага пункту наказу сваіх выбаршчыкаў?

Ня зноўдзеце вы таксама адказу ў справаздачы гарсавету і на тое, што зроблена гарсаветам па абслугоўваньні нацменшасьцей. Невядома таксама, ці арганізавана пры гарсавеце нацыянальная камісія, як гэта пастанавіў ЦВК БССР.

* * *

Тут акалічнасьць, што з друкаванай справаздачы гарсавету Менску—сталіцы БССР—«выпала» нацыянальнае пытаньне, нельга інакш разглядаць, як апартуністычную недаацэнку ленінскай нацыянальнай палітыкі з боку тых работнікаў, якія складалі справаздачу.

Пастанова кастрычніцкага пленуму ЦК КП(б)Б выразна адзначае, што «вялікадзяржаўны шавінізм праяўляецца часта пад маскай індыфэрэнтызму да пытаньняў нацыянальнай палітыкі партыі». У даным выпадку мы імённа і наглядаем такое «забыцьцё», індыфэрэнтызм (абыякія) адносіны да такога выключна важнага пытаньня, як нацыянальнае пытаньне, якое зьяўляецца «сутаўной часткай пралетарскай рэвалюцыі».

Мы патрабуем прыцягненьня да суровай партыйнай адказнасьці фракцыю Менскага гарсавету і непасрэдных вінаватых у складаньні такой справаздачы.

Разам з тым Менгарсавет павінен адказаць сваім выбаршчыкам на справаздачных сходах, праз друк на наступнае пытаньне:

Ці не зьяўляецца адсутнасьць у справаздачы даных на нацыятальні красамоўным довадам таго, што кіраўніцтва Менскага гарсавету ўзяло ў баку ад тэй вялізарнай работы і посьпехаў, якія дасягнуты партыяй на ажыцьцяўленьні на практыцы ленінскай нацыяльітыкі?

М. З.

Пастанова бюро Менскага гарадзкога камітэту КП(б)Б

аб ходзе справаздачна-перавыбарчай кампаніі гарсавету

1) Ход справаздачна перавыбарчай кампаніі гарсавету сьведчыць аб тым, што з боку ячэек КП(б)Б, ФЗМК, ЦІ саюзаў і гарсавету яшчэ не дасягнута неабходнага перадому у справе мабілізацыі рабочых і служачых вакол правядзеньня гэтай кампаніі, як важнейшай палітычнай кампаніі. Зрыў 28-мі сходаў сьведчыць аб безадказнасьці раду ячэек КП(б)Б і ФЗМК у выкананьні важнейшых дырэктыў партыі аб яўнай палітычнай недаацэнцы справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў.

2) Прасіць ГарКК у 4-хдзённы тэрмін прыцягнуць да партыйнае адказнасьці винаватых у зрыве наказаных сходаў.

3) Абавязаць парт'ячэйкі зрабіць рашучы перадом у правядзеньні справаздачнай кампаніі, забясьпечыць 100 проц. удзел рабочых і служачых у кампаніі, мабілізаваць актыўнасьць выбаршчыкаў у дзелавасьці а пастановамі сьнежаньскага Пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) на барацьбу за павялічэньне ролі саветаў у практычным ажыцьцяўленьні генэральнай лініі партыі і з канкрэтнымі правамі праяў практыкі, «левых» загібаў, а бюракратычнымі скажэньнямі у рабоце гарсавету, падпрадкаваўшы шырокай крытыцы ўсю дзейнасьць гарсавету.

4) Дабіцца прыцягненьня камуністаў і кандыдатаў на ўдзеле у справаздачна-перавыбарчай кампаніі гарсавету. У 3-хдзённы тэрмін абгаварыць на пазаячэйкавых сходах ячэек пытаньне падрыхтоўкі да справаздачна-перавыбарчай кампаніі.

5) Разгарнуць сапраўдзе сацыялістычнае ўдзельнае правядзеньне справаздачна-перавыбарчай кампаніі гарсавету на ленінскіх прадпрыемствах і ўстановах.

6) Прапанаваць парт'ячэйкам правесьці асобную працу сярод работнікоў і жонак рабочых аб іх удзеле у кампаніі, фракцыям саюзных органаў, гарсавету і ЖАКТ'ам забясьпечыць на час кампаніі бесьперабойную работу бытавых і дзіцячых устаноў і арганізацыю ў часе перавыбарчай кампаніі бытавых устаноў.

7) Друкаваную справаздачу гарсавету ў радзе месяц не адпавядае пастанове Бюро ЦК ад 26-га сьнежня па дакладу Менгарсавету. Справаздачна гарсавету не прасякнута самакрытыкай дзейнасьці гарсавету, не выяўляе перад рабочымі канкрэтнага скрыўленьня клясавай лініі, факты права-апартуністычнае практыкі, «левых» загібаў паасобных зьвеньняў савецкага апарату, зусім не асьвятляе працу ў галіне ажыцьцяўленьня нацыяльітыкі, у прадмове даны палітычна - накіраваньня фармулёўкі. Справаздачна такім чынам не мабілізуе і не завострае ўвагі рабочых на канкрэтных недахопах работы Менгарсавету, не выкоўвае практычных задач, якія вынікаюць з рашэньняў ЦК УсеКП(б) і КП(б)Б аб перабудове работы саветаў. Складаньне і выданьне такой справаздачы бюро гаркому расцэньвае як грубую палітычную памылку з боку фракцыі прэзыдыуму гарсавету.

Бюро адзначае асаблівую недапушчальнасьць выданьня такога важнага дакументу без абмеркаваньня яго папярэдня на фракцыі і прэзыдыуму гарсавету, што сьведчыць аб безадказнасьці кіраўніцтва гарсавету да складаньня справаздачы. Пытаньне аб памылках у гэтых адносінах тав. Аксючыца абгаварыць на наступным пасяджэньні бюро Г. К.

Бюро абавязвае фракцыю гарсавету ўнесьці ў 2-хдзённы тэрмін неабходныя напраўкі і дадаткі да справаздачы.

Склікаць на 8-га студзеня 1934 г. інструкцыйную нараду дакладчыкаў для правільнай арыентацыі іх аб характару справаздачы гарсавету перад выбаршчыкамі.

8) Абавязаць ячэйкі разгарнуць падрыхтоўку да выбараў гарсавету, забясьпечыўшы на справе пасылку ў савет лепшых ударнікаў - рабочых, праверанных актывістаў, адольных змагацца за правядзеньне генэральнае лініі партыі у рабоце гарсавету.

9) Агітмасаваму аддзелу правесьці канкрэтныя масавыя мерапрыемствы, забясьпечваючыя пасьпяховы ход кампаніі.

10) Пастанову апублікаваць у друку.

Чаму зрываюцца справаздачныя сходы

Даволі азнаёміцца з матар'ялямі справаздачнай кампаніі Менскага гарсавету, каб упэўніцца ў тым, што выбарчая камісія падрыхтоўку да перавыбараў па вынесла са сьцен свайго габінету.

На большасьці прадпрыемстваў Менску ў дастатнае была створаны спэцыяльная камісія сэкцыі дзейнасьці справаздачна - перавыбарчай кампаніі гарсавету. Аднак у гэтых камісіях ня быў выкананы гарсаветам для правядзеньня шырокай падрыхтоўчай работы да перавыбараў. Характэрна, што толькі ў Фрунзенскім раёне гарсаветам была выкінута інструкцыйная парада членам камісіі сэкцыі дзейнасьці справаздачна-перавыбарчай кампаніі.

Выбарчая камісія гарсавету, атрымаўшы пакуль і месяц і з ЦП прафсаюзаў аб справаздачна - перавыбарчай кампаніі, скасавала вызначэньні тэрмінаў сходаў і сказала аб гэтым па навесках, вывешаных прадпрыемствы і ўстановы. Фактычна план справаздачна-перавыбарчай кампаніі быў прынят без узгадненьня з прафсаюзамі і прадпрыемствамі. Усё гэта прывяло да таго, што за 6 дзён справаздачнай кампаніі сарвалася 28 сходаў на выбарчых участках, дзе павінна была быць абгаворана справаздача гарсавету.

Нельга не адзначыць, што плян справаздачнай кампаніі выбарчая камісія даслала прадпрыемствам і ўстановам з вялікім спазьненьнем. Так, у друкарню імя Сталіна плян быў дасланы на некалькі дзён пазьней тэрміну, у які павінен быў адбыцца сход са справаздачай гарсавету.

6 студзеня сарваліся справаздачныя сходы на хлебазаводзе.

Выбарчая камісія, як відаць не прыняла ніякіх захадаў, каб забясьпечыць пасьпяховае правядзеньне справаздачнай кампаніі. Грамадзкія арганізацыі прадпрыемстваў і ўстаноў і асабліва прафсаюзы ня менш вінаваты, чым выбарчая камісія, у зрыве справаздачных сходаў па 28 выбарчых вучасткам.

ЭЛЬ.

Апартуністычная справаздача Менскага гарсавету

Сьнежаньскі пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б) высунуў асноўнай палітычнай задачай у перавыбарах саветаў — «падняцьце ролі саветаў у правядзеньні на практыцы ленінскай палітыкі партыі... Перавыбары павінны стаць важнейшым сродкам карэнных перабудовы на справе ўсёй работы саветаў».

Асноўны сэнс справаздачна-перавыбарчай кампаніі павінен перш за ўсё заключацца ў тым, каб яшчэ больш падняць палітычную ролю саветаў, як праваднікоў генэральнае лініі партыі, якая вызначана XVI зьездам УсеКП(б).

Рад паасобных працуючых работнікаў не разумеюць, ці ня хочуць разумець гэтых важнейшых палітычных установак, чым на сутнасьці скочваюцца ў балота дзяклянства, апартунізму.

Газэта «Рабочай», зусім правільна ужо пісала аб тым, што Менскі гарадзкі савет выдаў пісьмовую справаздачу, у якой ёсьць рад направільных палітычна-шкодных фармулёвак. Падрабязнае азнаямленьне са справаздачай гаворыць за тое, што яна зусім не адбівае важнейшых гасцадарча-палітычных задач, якія стаяць перад гарсаветам, не наказвае таго, як гарсавет перабудаваў сваю работу ў адпаведнасьці з задачамі рэканструкцыйнага пэрыяду. Гэты дакумант ёсьць узор апартуністычных і бюракратычных адносін да важнейшай палітычнай кампаніі. Ён ні ў якой меры не дае сапраўднага малюнку масам працоўных аб рабоце гарадзкога савету і аб тых вялізарных дасягненьнях, якія маюць працоўныя, у прыватнасьці, сталіцы Савецкай Беларусі Менску, у будаўніцтве сацыялізму. Ён ня спрыяе мабілізацыі мас вакол важнейшых палітычных задач, якія стаяць перад гарадзкім саветам, не канцэнтруе ўвагі на тэй зьменнай і ўнутранай абстаноўцы, у якой прыходзілася працаваць гарсавету. Замест гэтага ў справаздачы ёсьць рад бытавых, штампаваных і шкодных фармулёвак.

Ва ўводнай частцы справаздачы апрача раду палітычна направільных фармулёвак сказана:

«Яшчэ і па сёньняшні дзень сусьветная буржуазія **не перастае** рыхтавацца да нападу на Савецкі Саюз». Мы хочам запытаць ці ў гэтых «мудрых» аўтараў справаздачы: ці могуць мірна існаваць дзьве сыстэмы гаспадаркі, а імённа, гаспадарка капіталізму, які разлагаецца, і пераможная сацыялізму? Кожны працоўны разумее, што **не.** Буржуазія не перастае рыхтавацца да вайны і не перастане, а, наадварот, яна шалёна рыхтуецца да яе. Падзеі на Кітайска-Ўсходняй чыгунцы ёсьць яркі прыклад генэральнай рэпэтыцыі буржуазіі да нападу на Савецкі Саюз. Працэс «прампартыі» выкрыў пляны інтэрвэнцыі супроць СССР, якія рыхтаваліся генштабамі капіталістычных краін, і ў першую чаргу Францыяй. Арышт групы беларускіх контррэвалюцыянэраў — нацыянал-дэмакратаў, якія зьяўляліся саюзьнікамі Рамэйна і агентамі польскага фашызму, таксама гаворыць за падрыхтоўку вайны. У сьвятле гэтых фактаў становішча зусім незразумелым, чаму ў дакумэнце не завострана гэта пытаньне. Чаму дэзарыентуюцца працоўныя масы фармулёўкамі «не перастае рыхтавацца», як быццам, калі-небудзь буржуазія **перастане** весьці падрыхтоўку да нападу на Савецкі Саюз. Гэта палітычна направільная і шкодная фармулёўка.

Важнейшай задачай справаздачна-перавыбарчай кампаніі зьяўляецца — праверка клясавай баяздольнасьці саветаў, іх барацьба як з клясавым ворагам, так і з яго агентурай у радох партыі, у радох саветаў, у радох пралетарскіх арганізацый, рашуча выкрываючы і выганяючы з саветаў і савецкага апарату канкрэтных носьбітаў кулацкай ідэалёгіі — правых капітулянтаў, іх саюзьнікаў — «левакоў», што бляскуюцца з правымі, і г. д. У справаздачы гарсавет ня выходзіць імённа з гэтай асноўнай установкі. Начынаючы ад прадмовы і канчаючы апошняй старонкай справаздачы, мы не знаходзім таго, як гарадзкі савет [illegible] на генэральную лінію партыі, супроць правага [illegible] і іх саюзьнікаў «левакоў». Канкрэтныя факты барацьбы з клясавым ворагам і яго агентурай выпалі з поля зроку тых, хто складаў справаздачу.

Хваля абуроньня і пратесту шырокай савецкай грамадзянскасьці супроць саюзьнікаў Рамэйна, агентаў польскага фашызму — групы беларускай нацыянал-



Афарбоўка гатовых ваганэтак для шоўкавага сырцу, прызначаных для магілёўскай шоўкавай фабрыкі (завод «Полымя Рэвалюцыі» (Менск)

дэмакратычнай інтэлігенцыі не дакацілася, як відаць, да кіраўніцтва гарсавету. Справаздача **зусім не закранае пытаньняў нацыянальнай палітыкі партыі.** На выкрыты канкрэтных носьбітаў вялікадзяржаўных шавіністаў, не паказана як гарсавет змагаўся з вялікадзяржаўным шавінізмам, які зьяўляецца галоўнай небясьпекай.

Таксама ў справаздачы ня выкрыты канкрэтныя носьбіты і правяы контррэвалюцыйнага нацыянал-дэмакратызму, шавінізму усіх колераў і г. д., не паказана, як савет вёў з імі барацьбу. Наогул пытаньні нацыянальнай палітыкі партыі абыйдзены моўчкі. Сюды яшчэ трэба дадаць, што ў сьпісах гарсавету лічыцца да гэтага часу махровы нацыянал-дэмакрат праф. Пічэта (нават пасьля пастановы сэсіі ЦВК БССР аб выдаленьні яго са складу ЦВК). Такія адносіны да нац. пытаньня нельга інакш кваліфікаваць як нацыянал-апартуністычныя.

Гарадзкі савет у сваёй рабоце меў цэлы рад праяваў у правядзеньні нацыянальнай палітыкі партыі. Трэба было перад шырокімі масамі працоўных выкрыць гэтыя праявы, мабілізаваць масы на канчатковае іх зьнішчэньне,— замест гэтага гарсавет **змазаў** гэта пытаньне.

Аб клясавай барацьбе ў справаздачы гарсавету напісана—«клясавая барацьба, якая асабліва абчувалася за апошні час... нязвана нельга інакш кваліфікаваць як нацыянал-апартуністычныя.

Гарадзкі савет у сваёй рабоце меў цэлы рад праяваў у правядзеньні нацыянальнай палітыкі партыі. Трэба было перад шырокімі масамі працоўных выкрыць гэтыя праявы, мабілізаваць масы на канчатковае іх зьнішчэньне,— замест гэтага гарсавет **змазаў** гэта пытаньне.

Аб клясавай барацьбе ў справаздачы гарсавету напісана—«клясавая барацьба, якая асабліва адчувалася за апошні час... нязвана нельга інакш кваліфікаваць як нацыянал-апартуністычныя.

СПРАВАЗДАЧА НЕ ПРАСЯКНУТА БАЛЬШАВІЦКАЙ САМАКРЫТЫКАЙ. Замест яе ў ёй ёсьць нітампаваныя дэкляцкія фразы, якія нічога не гавораць аб тэй рабоце, якую праводзілі шырокія масы працоўных, пад кіраўніцтвам партыі, на прадпрыемствах, у калгасах, ва ўстановах на барацьбе з клясава-варожымі элементамі.

Зусім пакалённіцкім і незразумелым становіцца сьцьвярджэньне справаздачы аб тым, што мы маем ахоп каапэрацыяй рабочага бюджэту па прадуктах спажываньня толькі на 56,1 проц. замест 59,6 проц. у 1928 годзе. Пры ўзросьце таваразвароту каапэрацыі і вышэйшыні прыватніка, зварот якога складае толькі 3 проц. у агульным таваразвароце, стане зусім ясным, што такія «вылічэньні» зьяўляюцца нічым іншым, як пакалёнам. Ня выкрыты таксама і тыя шкодніцкія дзеньні паасобных работнікаў каапэрацыі, якія былі ў МЦРК. Справаздача зусім абыходзіць моўчкі гэта пытаньне.

Наогул зусім **не пастаўлены вузлавыя праблемы рабочага забесьпячэньня.** У пытаньнях заработнай платы рабочых і паляпшэньня матар'яльна-бытавых умоў гарсавет сваімі лічбамі, якія паказаны ў справаздачы, фактычна заблытаў становішча заработнай платы, паказаўшы кафіцыент яе росту толькі на асобных прадпрыемствах.

Некаторыя такія зводкі без растлумачэньня робяць уражаньне, што ў нас ідзе зьніжэньне заработнай платы ў той час, як гэта зусім не адпавядае сапраўднасьці, бо мы маем няўхільны рост заработнай платы рабочых. Справаздача таксама не паказвае росту матар'яльна-бытавых умоў рабочае клясы. Ня ўлічаны ў заработак сродкі на паляпшэньне жыльлёвых умоў рабочых, на сацстрах, на дамы адпачынку, на культурна-асьветныя патрэбы і г. д. Такі мэтад вылічэньня заработнай платы (толькі фактычны месячны аклад) ёсьць мэтад меншавіцкі, які ўжывалі меншавікі з статыстычнага аддзелу УсеЦСПС для таго, каб затушаваць рост зарплаты і тыя вялізарныя выдаткі, якія адпускаюцца дзяржавай для паляпшэньня матар'яльна-бытавых умоў рабочае клясы.

Рост актыўнасьці рабочае клясы зусім не адбіт у справаздачы гарсавету. Не закрануты таксама пытаньні карэннай перабудовы работы савету ў адпаведнасьці з задачамі, якія перад ім пастаўлены нашай партыяй.

Справаздача ні ў якім разе не высьвятляе важнейшых палітычных пытаньняў, яна складзена па-дзяляцку, у ёй адсутнічае самакрытыка, яна мае рад направільных палітычна-шкодных фармулёвак. Фракцыя гарадзкога савету павінна зрабіць адпаведныя выводы з гэтага палітычна-шкоднага дакументу. Справаздачна-выбарчую кампанію гарадзкога савету трэба правесьці бальшавіцкай самакрытыкай. Справаздача павінна быць пабудавана, выходзячы з таго, наколькі гарсавет стаў на чале ўзросшай актыўнасьці рабочых мас, наколькі ён мабілізаваў іх на выкананьне важнейшых задач партыі па сацыялістычным будаўніцтве. Факты гавораць за тое, што кіраўніцтва гарсавету ня стала на чале актыўнасьці мас, не разгарнула бальшавіцкай самакрытыкі, як асноўнага мэтаду перабудовы усёй работы, не разгарнула масавай работы вакол савету, не ўцягнула ў яе шырокія пласты рабочых. Разгортваючы бальшавіцкую самакрытыку, пад знакам упартай барацьбы за генэральную лінію партыі павінна правесьці ўся справаздачна-перавыбарчая кампанія.

Усё... і нічога канкрэтнага

Сход рабочых-будаўнікоў па справаздачы Менскага гарадзкога савету пачаўся позна. З 270 чал. сабралася ўсяго 180. Але-ж сход адкрылі. Слова атрымаў член прэзыдыуму гарсавету т. **Кавалёў.** Дакладчыку далі адну гадзіну. За гэтый час дакладчык шмат гаварыў «наогул», толькі не аб практычнай рабоце савету.

На адным, а потым групамі пачынаюць кідаць сход.

Паўтары гадзіны, гаварыў дакладчык аб тым, што «мы маем дасягненьні вялізарных разьмераў», а што **зроблена — нічога не сказаў.** Рабочыя задавалі пытаньні:

— Што канкрэтна зрабіў гарсавет па пытаньні барацьбы за выкананьне прам фінпляну?

— Чаму дакладчык ні слова не сказаў аб выкрытым шкодніцтве ў каапэрацыі?

— Якую барацьбу гарсавет вёў з контр-рэвалюцыйным беларускім нацыянал-дэмакратызмам, вялікадзяржаўным шавінізмам?

— Чаму ў справаздачы гарсавету няма ніводнага слова аб нацыянальнай палітыцы?

На заданыя пытаньні дакладчык ня мог адказаць.

У спрэчках выказвалася мала. Прычына? Прычына ў тым, што ні партыйная, ні прафэсыянальная арганізацыі на будаўніцтвах **не правялі ніякай падрыхтоўчай работы.**

Але-ж тыя спрэчкі, якія былі, насілі падвычай дзеланы характар.

— Складзеная справаздачная брашура выразна сьведчыць аб палітычнай сьлепаце яе складальнікаў, — гаворыць рабочы Ганчарык. — Між іншым ніводнага слова не сказана аб тым, што зроблена ў барацьбе з затаваньнем МЦРК дэфіцытнымі таварамі.

— Калі дакладчык не падышоў самакрытычна да работы кіраўніцтва саветам, дык нам трэба крытыкуць, як належыць, — гаворыць рабочы Тунік.

На сходзе выявілася, што прамысловая сэкцыя толькі арганізоўвала брыгады для пасылкі на прадпрыемствы, выносіла вялікія рэзалюцыі, а практычнай работы не праводзіла. Лік пасяджэньняў пленуму гарсавету быў вялікі, але кіраўнікі гарсавету не правяралі, як выконваюцца пастановы пленуму і прэзыдыуму.

Тав. Кавалёў застаўся вельмі незадаволеным крытычкай рабочых і таму заявіў сходу: «А вы савету дапамагалі? Вы толькі на сходзе можаце балбатаць!».

На думцы Кавалёва рабочыя не павінны гаварыць аб бязьдзейнасьці кіраўнікоў гарсавету.

Такая заява бязумоўна адбілася на актыўнасьці. Многія выбаршчыкі пакінулі сход.

Справаздачны сход у будаўнікоў можа служыць прыкладам арганізацыям іншых прадпрыемстваў, як **ня трэба рыхтавацца да правядзеньня важнейшай палітычнай кампаніі.**

Трэба зрабіць паўторную справаздачу пры забесьпячэньні 100 проц. яўкі на сход.

А. СВАБОДНЫ.

„Зьвязду"—у масы

У Полацку няма зруху

Мы ня раз ужо адзначалі, што ў г. Полацку справа з падпіскай на «Зьвязду» абстаіць зусім дрэнна. Між тым, зруху да гэтага часу няма.

Райком КП(б)Б не зварачае ўвагі на прэссўваньне цэнтральнага органу ЦК КП(б)Б «Зьвязды» ў масы партыйцаў і працоўнага насельніцтва, не праводзіць адпаведнай работы ў гэтым напрамку.

Нічога ня робіць і газэтнае бюро Полацку. На вялікі жаль, ва ўсіх матар'ялах (даклады, рэзалюцыі і інш.) парад якія склікала газбюро па пытаньні распаўсюджаньня друку, зусім мала часамі нічога не гаворыцца аб стабо падпіскі на «Зьвязду» і далейшых задачах на яе распаўсюджаньні.

Праўда, у свой час нарала ўпаўнаважаных на распаўсюджаньні друку і газэтных працаўнікоў Полацку прыняла выклік добрускай партыйнай арганізацыі аб павялічэньні падпіскі. Але ўсё гэта засталося толькі на паперы, рэальных вынікаў няма.

Такія адносіны з боку райкому КП(б)Б і газэтнага бюро да пашырэньня «Зьвязды» пікуды ня вартыя.

Усяго па г. Полацку (і ўсім раёне) на студзень выпісваецца 480 экз., што ў адносінах да ліку чыснаў і кандыдатаў КП(б)Б складае 44 проц.

Так ажыцьцяўляе Полацкая партарганізацыя лёзунг «Ні адзіна партыйца без «Зьвязды».

Пастанова... засталася на паперы

У сьнежні мінулага году культпроп Халопяніцкага райкому КП(б)Б, абгаварыўшы пытаньне аб далейшым пашырэньні газэты «Зьвязда», пастанавіў — павялічыць падпіску на раёне на 500 экз.

Работу па папулярызацыі «Зьвязды» і непасрэдная вярбоўцы падпісчыкаў узяла на сябе 21 пачатковая партшкола. Усё гэта давала падставы спадзявацца, што падпіска на цэнтральны орган КП(б)Б будзе значна павялічана.

Аднак, на справе маем адваротнае. Культпроп райкому, прыняўшы пастанову аб павялічэньні падпіскі, на гэтым і спыніўся, ня прыняўшы належных мер да правядзеньня пастановы ў жыцьцё. Спадзяючыся, што задача па павялічэньні падпіскі на 500 экз. будзе выканана партшколай, культпроп чамусьці не праверыў, як разгорнута работа і ці забясьпечвае яна посьпех у выкананьні пастаўленай задачы. Разам з гэтым партыйная школа, узяўшы на сябе гэту работу, нічога не зрабіла для павялічэньня падпіскі.

Вольш таго, з боку райкому ня прынята ніякіх меры, каб замацаваць падпіску, якая была ўсьнежні. У выніку лік падпісчыкаў значна зьнізіўся. Так, калі ў сьнежні выпісвалася 240 экз., то на студзень — толькі 196 экз.

Д.

Міма барацьбы за прамфінплян

Пры Менскім гарадзкім савеце ёсьць прамысловая сэкцыя. Раней гэта сэкцыя мела назву сэкцыі працы.

Роля гэтай сэкцыі зведзілася да праверкі работы біржы працы; з гэтай работай спачатку сэкцыя спраўлялася, абсьледаваўшы паасобныя біржы працы.

Зараз перад сэкцыяй паўсталі новыя задачы — дапамагаць прадпрыемствам у барацьбе за прамфінплян. Сэкцыя павінна была мабілізаваць шырокія колы лепшых ударнікаў і ў парадку добраахвотнасьці паслаць іх на тыя прадпрыемствы, на якіх былі буйныя прарывы ў прамфінпляне, дзе патрабавалася практычная дапамога ў ліквідацыі прарываў.

Чым-жа можа пахваліцца старшыня прамсэкцыі тав. Гольдбэрг сёньня перад выбаршчыкамі? На гэта пытаньне адказаў сакратар гарсавету тав. Пасынкоўскі наступным чынам:

— Прамсэкцыя вельмі шмат засядала, вынесла вялікую колькасьць прапаноў, была выпрацавана спэцыяльная памятка з указаньнем, як ліквідаваць прарывы.

Ну, а як-жа ўсе гэтыя мерапрыемствы праведзены ў жыцьцё? На гэта запытаньне кіраўнікі гарсавету **адказаць ня могуць.** Прыйшлося запытаць у ВСНГ аб увязцы работы прамсэкцыі гарсавету з гаспадарчымі арганізацыямі ў пытаньнях дапамогі ў барацьбе за прамфінплян. Работнікі ВСНГ адказалі, што ніякай практычнай дапамогі ня было, а толькі можна адзначыць, як дасягненьне гарсавету, тое, што быў заслухан даклад тав. Стракоўскага аб выкананьні прамфінпляну рэспубліканскай прамысловасьці.

Гарсавет ня імкнуўся наладзіць увязань работу прамсэкцыі з сэктарам вытворчасьці і зарплаты ЦСПОБ.

Нашы прадпрыемствы, напрыклад, абутковая фабрыка, швейная фабрыка «Кастрычнік», штотачная імя Крупскай, мелі значныя прастоі з-за адсутнасьці электраэнэргіі на віне электрастанцыі, а што зроблена гарсаветам для таго, каб паслаць дэпутатаў і высьветліць прычыны адсутнасьці электрычнай энэргіі, з прычыны чаго ня выконвацца прамфінплян?

У прамысловым раёне — Ляхаўцы з году ў год уносяцца прапановы ў наказ —правесьці там электрычнасьць, але да гэтага часу па гэтых пытаньнях нічога ня зроблена.

У нас, у Менску, на буйных фабрыках ёсьць па 8-10 дэпутатаў гарсавету, якія навінны складаць групу дэпутатаў, сыгналізуючых гарсавету аб прарывах і непаладках на прадпрыемствах, гэтага таксама ня зроблена.

Ні па адным прадпрыемстве нельга заўважыць, каб наказ быў вывешан на відным месцы, каб кожны рабочы мог бачыць сваю прапанову, унесеную ў наказ, і запытаць у дэпутата, як выканана яго прапанова.

На такое запытаньне рабочаму дэпутат не адкажа, бо сам часта ня ведае, што выканана і што ня выканана.

Тав. Пасынкоўскі, нарэшце, прызнаецца, што прамысловая сэкцыя і кіраўнікі гарсавету слаба займаліся пытаньнямі дапамогі заводам у выкананьні прамфінпляну.

На запытаньні — ці былі якія-небудзь льготы для ўдарнікаў у справе прадастаўленьня ім у першую чаргу кватэр?

— Якая розьніца — ударнік ці не-ўдарнік, усім патрэбны кватэры і мы дападкава прадастаўляем у парадку чаргі—вось адказ аднаго з кіраўнікоў гарсавету.

Прамысловая сэкцыя гарсавету з работай ня справілася.

А. М—ў.

Палітычная блізарукасьць

Справаздачна-перавыбарчая кампанія **Віцебшчыны** праходзіць незадавальняюча. Гарнрафсавет да падрыхтоўкі гэтай кампаніі прыступіў толькі ў лістападзе месяца. Гарком камсамолу толькі 5-га сьнежня паставіў гэта пытаньне на пасяджэньні бюро.

Гарадзкі выбарчы камітэт працуе незадавальняюча. Пасяджэньні яго ўвесь час зрываліся з-за няяўкі членаў камітэту. Выбарчы камітэт ня меў цеснай сувязі з камісіям сэдзейнасьці пры прадпрыемствах і ўстановах. Палітычную блізарукасьць праявілі выбарчы камісіі складаньні справаздачы гарсавету. Палітычная частка справаздачы была змазана. **Справаздача не гаварыла аб тым, як гарсавет змагаўся за генэральную лінію партыі, зусім зьнікла са справаздачы клясавая барацьба. Справаздача не гаварыла аб неабходнасьці барацьбы з правым ухілам, як галоўнай небясьпэкай на даным этапе, зусім не закранула неабходнасьці змаганьня з вялікадзяржаўным шавінізмам, контррэвалюцыйным нацыянал-дэмакратызмам і шавінізмамі розных колераў.** У справаздачы адсутнічаюць лічбы аб нацыянальным складзе гарсавету.

Гарком партыі вынес фракцыі гарсавету вымову і пэрсанальныя спагнаньні, затрымаў выпуск справаздачы.

Ня лепш стаяла справа і з наказам, дзе было вынесена шмат важнейшых палітычных момантаў.

Гэтыя факты гавораць аб тым, што выбарчы камітэт хварэе палітычнай блізарукасьцю і яго сучасны склад не забясьпечвае далейшага пасьпяховага правядзеньня справаздачна-перавыбарчай кампаніі гарсавету.

* * *

У сувязі са справаздачна-перавыбарчай кампаніяй гарсавету наглядаецца прыток ударнікаў (каля 1.500), каля 2.000 прапаноў да наказу, 60 лепшых рабочых-ударнікаў падалі заявы ў партыю.

Аднак, побач з гэтым ёсьць зрывы перавыбарчых сходаў гарсавету з-за дрэннай падрыхтоўкі (вэтінстытут, ф-ка «Дзьвіна», будаўнікі, саюз саўгандальслужачых, завод «Камінтэрн»).

Трэба адзначыць, што з боку некаторых партыйных ячэек ёсьць недаацэнка важнейшай палітычнай кампаніі.

Гэтымі днямі пленум гарадзкога камітэту партыі абмеркаваў пытаньне ходу справаздачна-перавыбарчай кампаніі, вызначыў рад мерапрыемстваў да выпраўленьня прарываў. Так, на прарывах сходаў адбілася тое, што на дырэктыве гарсавету справаздачы і перавыбары праводзіліся ў адзін

МЕНСК

Новыя трамвайныя лініі

(Гутарка з дырэктарам транспартнага трэсту т. ДАШЧАТАВЫМ)

У надыходзячым будаўнічым сэзоне пачнецца пракладка новай трамвайнай лініі СЕРАБРАНКА—КАЛЬВАРЫЯ. Даўжыня лініі—6 кілёмэтраў двайнога шляху. Пабудова лініі будзе скончана яшчэ ў гэтым годзе. Кошт пабудовы вызначан у 580.000 руб.

Пракладка трамвайнай лініі на Ляхаўцы пачнецца ў 1932 г. Гэта работа зьвязана з пабудовай новага бэтоннага маста праз раку Сьвіслач. Будаваць мост мяркуем пачаць у гэтым годзе.

Паводле пляну, у бягучым годзе павінна быць павялічана колькасьць трамвайных вагонаў. У трэцім квартале ў Менск прыбудуць шэсьць маторных і чатыры прычэпных вагоны. Акрамя таго будуць атрыманы тры маторныя і сем прычэпных пляцформаў для перавозкі грузаў і адзін сьнегагрыбачальнік.

Транспартны трэст прыступіў да правядзеньня мерапрыемстваў па выкарыстаньні трамвайнай лініі для грузаперавозак. На станцыі МБЕ чыгтаварный трамвайная лінія злучана веткай да лініі чыгункі. Заканчваецца пабудова веткі да Эльводу. Распрацоўваецца таксама пытаньне аб пабудове ветак да заводу «Беларусь» і іншых прадпрыемстваў.

У бягучым годзе мяркуецца пашырыць аўтабусны рух па горадзе. Прэзыдыум гарсавету зацьвердзіў кантрольную лічбу на павялічэньне аўтатранспарту ў суме 1.105.000 руб.

НА ПРАЦЯГУ 1931 г. БУДЗЕ АТРЫМАНА 5 ЛЕГКАВЫХ АЎТАМАБІЛЯЎ, 11 АЎТАБУСАЎ, 20 ГРУЗАВІКОЎ і 5 ЛЕСАВОЗАЎ. АЎТАБУСЫ БУДУЦЬ СКАРЫСТАНЫ ДЛЯ АБСЛУГОЎВАНЬНЯ АКРАІН ГОРАДУ І ПРЫГАРАДНЫХ САЎГАСАЎ.

10-га студзеня пачынаецца праверка ходу падрыхтоўкі да веснавой сяўбы

У мэтах узмацненьня працы па капэнтрызацыі, перазьбарах у калгасах і праверкі ходу падрыхтоўкі да веснавой с.-г. кампаніі калегія НКЗ і Белкалгасцэнтр пастанавілі правесьці з 10 студзеня па 10 лютага агляд гэтай работы ва ўсіх раёнах БССР.

Для гэтай мэты ў раёны накіроўваюцца ў якасьці ўпаўнаважаных НКЗ і Калгасцэнтру 34 адказныя працаўнікі. Сярод іх т. т. Рачыцкі, які выяжджае ў Заслаўскі, Смалявіцкі і Астрашыцка-Гарадзецкі раёны, Міцкэвіч, Лаціс, Сьмірноў, Масюкоў, Пыжыкаў, Бондар, Талапіна, Аўчыньнікаў, Паніматка, Грэбенчык і інш.

НКЗ і Белкалгасцэнтр абавязалі паказаных т. т. выехаць у раёны ў вызначныя ім тэрміны. Аргінструктарскаму сэктару даручана даць выяжджаючым работнікам дырэктывы па пасеўнай кампаніі, па перавыбарах у калгасах, па выторчых заданьнях у саўгасах, па пытаньнях калектывізацыі, будаўніцтве МТС, арганізацыі спэцыялізаваных калгасаў і саўгасаў.

Курсы нізавога актыву МОПР'у

Цэнтральны і гарадзкі камітэт МОПР'у адкрываюць у Менску месячныя курсы па падрыхтоўцы нізавога мопраўскага актыву. На курсы будуць прыняты пераважна старшыні і сакратары ячэек МОПР'у.

Усяго праз курсы пройдзе каля 300 чалавек.

Фініш лыжнай эстафэты

10 студзеня на пляцы Волі адбудзецца фініш лыжнай эстафэты, прысьвечанай X ўсебеларускаму зьезду ЛКСМБ.

Увечары адбудзецца агульна-гарадзкая дэманстрацыя фізкультурнікаў, прысьвечаная зьезду ЛКСМБ і перавыбарам гарсавету.

Паведамленьні

Сёньня

— 8 студзеня ў 6 гадз. веч. у памяшканьні ЦВК БССР адбудзецца пасяджэньне прэзыдыуму нац. камісіі ЦВК БССР сумесна з брыгадзірамі, якія, згодна пастановы ЦК КП(б)Б, выяжджалі ў раёны па перавыбарах нац. саветаў. Прысутнасьць па пасяджэньні камісіі ніжэй азначаных т. т. абавязкова: Іткін —рад. «Юнг. Арбэтэр», Окунь—Яўпадтэхн., Альтман — Цэнтрвыдавецтва, Гольдман—рэдсэк «Пралетары», Эфрон—Белсельпрамсаюз, Трус, Рагінскі, Рымашэўскі—БДУ, Мікуш—Жакт № 12, Кукелка—Польпадтэхнікум, Дзяржынская —НКАсьветы, Яніцкі—польскі н.-суд, Бернацкі—Белдзяржбуд, Сьвішч—політ. адд. № дыв., Шкільтэр—БАН, Спарынскі—НКАсьветы, Мееровіч—Менгарсавет, Гінзбург—студэнт «Барысаўскі студ. барак № 1, кв. 5», Юлюшыс—Белпад тэхнікум, Вайшнорас—рэд. «Раўдонасіс Артояс», Рагоўскі—Белкамэст.

— БАН. 8 студзеня ў 2 гадз. дня адбудзецца пасяджэньне асьпіранцкай камісіі. Яўка абавязкова.

— Гарком МОПР'у. Па-зачарговае пасяджэньне прэзыдыуму гаркому МОПР'у пры удзеле сэктараў, адбудзецца 8 студзеня ў 7 гадз. веч. у памяшк. ЦК МОПР'у. Запрашаецца актыў.

ДРУГІЯ ТЭРМІНЫ НЯ ДАНЫ

Крычаўскі цэмэнтны волат і гомельскі дрэваапрацоўчы камбінат уключыць у строй у трэцім годзе

Безадкладна пачаць падрыхтоўку да будаўнічага сэзону 1931 году

Ліквідаваць спадчыну шкодніцтва

2 МЛН. РУБЛЁЎ НЕ ПАВІННЫ ЛЯЖАЦЬ МЁРТВЫМ КАПІТАЛАМ

Скончыць у тэрмін будаўніцтва Нова-Беліцкага дрэваапрацоўчага камбінату

Ужо больш году, як БЕЛДЗЯРЖБУДАБ'ЯДНАНЬНЕ пачало будаваць у НОВАБЕЛІЦЫ (Гомель) вялізарнейшы дрэваапрацоўчы камбінат. Кошт гэтага будаўніцтва вызначан у 6 з лішкам мільёнаў рублёў. Дагэтуль на будаўніцтва ўжо выдана каля 2 млн. рублёў.

Да 1 мая павінны быць пушчаны тры галоўныя цэхі: ПЕРШЫ КАЛЁСНЫ, ДРУГІ КАЛЁСНЫ І ДРЭВААПРАЦОЎЧЫ.

Іншыя цэхі — рамонтна-мэханічны, перкетны, мэбловы, электра-парачная майстэрня і сушылка — павінны быць пушчаны не пазьней кастрычніка 1931 году.

Цяперашняе становішча на будаўніцтве не гарантуе таго, што цэхі будуць пушчаны ў тэрмін.

Дзе абсталяваньне

Па-першае, дагэтуль яшчэ ня высьветлена фінансавае становішча камбінату. Каб скончыць у першым квартале пабудову трох цэхаў, патрэбна 760 тыс. рублёў. «Союзлеспром» адпусьціў толькі 340 тыс. руб.

Не хапае абсталяваньня. Дагэтуль ніхто не пацікавіўся ад тым, каб забясьпечыць калёсныя цэхі такарнымі варштатамі для кацёлак, шпіндэльнымі вертыкальнымі сьвідравальнымі варштатамі, шпіндэльнымі цыркуляркамі. Не хапае таксама трох пакацільных прасаў для наводкі абадоў, стругальнага варштату з двума пажаўнымі валамі, гарызантальнага фрэзэра, вальцавачных варштатаў для колец і г. д. Замест патрэбнай пэдальнай пілы, на будаўніцтва прыслалі балянсірную пілу, якая вусім непатрэбна камбінату.

Для дрэваапрацоўчага цэху яшчэ не заказаны патрэбныя вэнтылятары і казёрыфэры. Бяз вышэй паказаных варштатаў нельга прыступіць да абсталяваньня цэхаў.

Да гэтага часу Лесбел яшчэ не прапрацаваў пытаньня аб метадах падачы лікдэпу з лесазаводу да электрастанцыі.

200 рабочых блукаюць у пошуках работы

Ужо сёньня двух месяцаў, як скончаны будаўніцтвам каробкі ўсіх корпусоў. Але з унутранымі работамі Белдзяржбудаб'яднаньне злачынна марудзіць. Ня зроблены ні падлогі, ні вокны, ні дзьверы.

У памяшканьні, ДЗЕ ЗНАХОДЗІЦЦА 40 ЗАМЕЖНЫХ ВАРШТАТАЎ, ня зроблены ўнутраныя вадаадпівы, у выніку варштаты ад вады іржавеюць і псуюцца.

Уже год, як склады, вызначаныя для сырцу, НЕ ПАКРЫВАЮЦЦА ДАХАМІ. Яшчэ ўвесень трэба было скончыць будаваць 4 кіёскі для электрастанцыі, але Белдзяржбудаб'яднаньне не сьпяшаецца. У жыльлёвых памяшканьнях ня скончаны падпогі, дзьверы, усходы.

Замест таго, каб прыкласьці ўсе намаганьні для своячасовага пуску камбінату, на які ўжо патрачана каля 2 млн. руб., Белдзяржбудаб'яднаньне скарыстала 25 вагонаў лесаматар'ялаў, вызначаных для камбінату, на іншыя пабудовы. Тое самае зроблена і з стругальнымі дошкамі.

Безгаспадарчасьць і адсутнасьць пляпавасьці на будаўніцтве прывялі да таго, што зараз 200 рабочых блукаюць на будаўніцтве і ня маюць нагрузкі.

Нельга ня сьмяяцца і на адносінах да будаўніцтва з боку ВСНГ.

Пасьля зацьвярджэньня праекту электрастанцыі ў 1.000 клв. камбінат ужо прыступіў да будаўніцтва станцыі, запатрабаваны адпаведныя тэхнічныя матар'ялы, прыстасавана месца. Раптам ВСНГ зьмяняе праект, павялічыўшы магутнасьць электрастанцыі да 4.000 клв. Прасктаў-жа новай электрастанцыі ВСНГ на працягу звыш 2-х месяцаў не прысылае.

Шкодніцкія праекты „Дрэўбуду"

Праекты паасобных цэхаў, якія былі прысланы спачатку «Дрэўбудам», інакш, як шкодніцкімі, назваць нельга. Паводле гэтых праектаў камбінат павінен быў вырабляць у 3 зьмены 57 тыс. станаў калёс у год і 25 тыс. дэталяй.

Неадпаведнасьць паміж колькасьцю калёс і дэталямі адразу-ж выклікала надзвычайную у заводкіраўніцтва. Выкліканы для праверкі інжынэр канстатаваў, што бесьпаўнейшая магчымасьць выробляць 70 тыс. станаў калёс і столькі-ж дэталяй ня ў 3, а ў дзьве зьмены. Апрача гэтага, шкодніцкі з «Дрэўбуду» прапанавалі вусім нягодныя для камбінату імпартныя варштаты. Дзякуючы пільнасьці заводкіраўніцтва, гэта было папярэджана.

Аб кадрах для камбінату ніхто не клапоціцца

Нарэшце, аб будучых кадрах для камбінату. Для пуску трох цэхаў камбінату праз некалькі месяцаў патрэбна будзе 375 КВАЛІФІКАВАНЫХ І 100 ДАПАМОЖНЫХ РАБОЧЫХ. Напрыклад, патрэбна будзе 36 цыркулярнічыкаў, 51 токар, 44 сьвідравальшчыкі, 26 фрэзэрнічыкаў, 21 стругальшчык, 12 электранітавальшчыкаў і г. д.

Фактычна-ж і Лесбел, і заводкіраўніцтва вельмі мала зрабілі для падрыхтоўкі кваліфікаванай рабочай сілы. На віне Лесбелу зараз зрываецца работа ФЗВ; 66 вучняў ФЗВ зьбіліся ў цесным кутку клюбу. На працяку 5 месяцаў ні Лесбел, ні работнікі камбінату не падрыхтавалі праграмы іх навучаньня; ФЗВ не забясьпечан ні інструктарамі, ні выкладчыкамі. Для практычнай работы няма і варштатаў. Сярод вучняў зараз такі настрой, што многія з іх думаюць разьехацца. Ніхто з іх не падрыхтаваны да работы.

На некаторых прадпрыемствах БССР працуюць кваліфікаваныя калёсьнікі, мэблеўшчыкі і гнутары, якіх бязумоўна можна скарыстаць на камбінаце, але-ж адзел кадраў гэтым ня цікавіцца. Праз некалькі тыдняў 22 вучні кончаюць школу «Дрэваапрацоўшчык», але-ж ніхто не пацікавіўся тым, каб замацаваць гэтых рабочых за камбінатам.

Між тым, пры пуску ўсіх цэхаў камбінату патрабуецца каля 2 тыс. рабочых.

Такога становішча з падрыхтоўкай рабочай сілы далей цярпець нельга. Гэтай справай павінны зацікавіцца Наркампрацы і Лесбел.

РСІ павінна ўзяць пад неаслабны кантроль будаўніцтва камбінату. Два мільёны рублёў, укладзеныя ў будаўніцтва, не павінны ляжаць мёртвым капіталам. Камбінат павінен быць пушчан у вызначаныя тэрміны.

МАЛАСТОЎКЕР.



На будаўніцтве крычаўскага цэмэнтнага заводу.

Крычаўскі волат

ПУСЬЦІЦЬ 1-га ЛІПЕНЯ

СНК БССР аб крычаўскім будаўніцтве

СНК БССР НЯДАЎНА ЗАСЛУХАЎ ПАДРАБЯЗНЫ ДАКЛАД АБ ХОДЗЕ БУДАЎНІЦТВА КРЫЧАЎСКАГА ЦЭМЭНТНАГА ЗАВОДУ.

У СПЭЦЫЯЛЬНАЙ ПАСТАНОВЕ СНК АДЗНАЧАЎ, ШТО ХОД БУДАЎНІЦТВА І АБСТАЛЯВАНЬНЯ КРЫЧАЎСКАГА ЦЭМЭНТНАГА ЗАВОДУ НЯ ТОЛЬКІ НЕ ЗАБЯСЬПЕЧВАЕ ПУСК ЯГО Ў ВЫЗНАЧАНЫ РАНЕЙ ТЭРМІН — 1 КРАСАВІКА 1931 ГОДУ, АЛЕ НАВАТ І Ў ТЭРМІН, ВЫЗНАЧАНЫ САМІМ «СТРОМСТРОЕМ» — Г. ЗН. 1-га ЖНІЎНЯ 1931 ГОДУ.

СНК ПАСТАНАВІЎ ПРАПАНАВАЦЬ ВСНГ БССР ПАВЕДАМІЦЬ ВСНГ СССР АБ ТЫМ, ШТО НА БУДАЎНІЦТВА КРЫЧАЎСКАГА ЗАВОДУ ЎЖО ВЫДАТКАВАНА КАЛЯ 3 МЛН. РУБ. ЧАСТКА АБСТАЛЯВАНЬНЯ КОШТАМ У 1 МЛН. 200 ТЫС. РУБ. ЗНАХОДЗІЦЦА НА ЗАВОДЗЕ І ЛЯЖЫЦЬ МЁРТВЫМ КАПІТАЛАМ. У СУВЯЗІ З ГЭТЫМ ПАСТАВІЦЬ ПЫТАНЬНЕ АБ ПРЫНЯЦЬЦІ РАДУ ТЭРМІНОВЫХ ЗАХАДАЎ ДА ПУСКУ КРЫЧАЎСКАГА ЗАВОДУ НЕ ПАЗЬНЕЙ 1 ЛІПЕНЯ 1931 ГОДУ, АДНАЧАСОВА ДАРУЧЫЦЬ «СТРОМСТРОЮ» КАНЧАТКОВА ВЫЗНАЧЫЦЬ КАЛЯНДАРНЫ ПЛЯН СКАНЧОНЬНЯ АСОБНЫХ РАБОТ НА БУДАЎНІЦТВЕ, ЗАБЯСЬПЕЧЫЎШЫ ЯГО ПАТРЭБНЫМ АБСТАЛЯВАНЬНЕМ.

23 СТУДЗЕНЯ СНК БССР ЗАСЛУХАЕ ДАКЛАД ПРАДСТАЎНІКА «СОЮЗСТРОМСТРОЯ» АБ КАЛЯНДАРНЫМ ПЛЯНЕ БУДАЎНІЦТВА І ПУСКУ КРЫЧАЎСКАГА ЦЭМЭНТНАГА ЗАВОДУ.

«Зьвязда» своячасова завастрыла ўвагу пралетарскай грамадзкасьці БССР на тых перашкодах, якія адчувае будаўніцтва крычаўскага цэмэнтнага заводу.

Партыйнымі і ўрадавымі органамі былі даны катэгарычныя дырэктывы аб сканчэньні ў тэрмін крычаўскага будаўніцтва. Ня гледзячы на гэта, Белдзяржбудаб'яднаньне, «Стромстрой» і адміністрацыя пабудовы ўсё яшчэ не перайшлі на бальшавіцкія тэмпы работы.

Белбудаб'яднаньне дагэтуль яшчэ не забясьпечыла пабудову поўнасьцю патрэбнымі лесаматар'ялам, арматурным жалезам і інш.

Шмат работ, як абшыўка вокан электрастанцыі, установка бакавых рам у рабочых кварталах і інш. не праводзяцца.

«Стромстрой» (Масква) дагэтуль ня выслаў чарцяжоў фундаментаў пад абсталяваньне электрастанцыі і гэтым затрымлівае мантажныя работы.

Чыноўнікі, а можа і шкодніцкія з «Стромстроя» сваімі галавалянскімі распараджэньнямі ўвесь час тармозяць пабудову заводу. Вось факты.

Для сканчэньня пабудовы трансформатарных кабінак і размеркавальных установак засталося некалькі тыдняў. Але нечакана «Стромстрой» прыслае тэлеграму аб прыпыненьні гэтых работ. Пабудова эстакады для вальцы тор фу ў качагарку, паводле заказу «Стромстроя», прыпынена з тае прычыны, што гэту работу трэба будзе пераробіць па другім праекце, а вось новага праекту «Стромстрой» пакуль што ніяко ня выслаў.

Прысланы чарцёж для трансформатарнай будкі нельга скарыстаць, бо ў генэральным пляне ня вызначана месца, дзе гэту будку трэба будзе паставіць.

Да пачатку мантажных работ застаецца ўсяго адзін месяц, але «Стромстрой» дагэтуль яшчэ ня прыслаў патрэбнага пляну правядзеньня мантажных работ. Гэта затрымлівае своячасовую падрыхтоўку рабочай сілы.

Не хапае і электраабсталяваньня.

Адміністрацыя пабудовы вельмі марудзіць з палапшаньнем быту рабочых. Адцяпельне бараках праведзена вельмі дрэнна, пральня не абсталявана.

Усе паданыя вышэй факты гавораць аб нагрозе своячасовага сканчэньня будаўніцтва.

Белбудаб'яднаньне павінна нарэшце ўжыць тэрміновыя меры да забясьпечаньня пабудовы патрэбнымі матар'ялам. Адміністрацыя будаўніцтва павінна безадкладна палепшыць бытавыя ўмовы рабочых.

Заводзкія арганізацыі павінны і надалей праводзіць бязьлітасную барацьбу з прагуламі.

Крычаўскі цэмэнтны завод павінен быць скончан у найхутчэйшым тэрміне.

Брыгадзір «Зьвязды» З—ы.

Адказны рэдактар С. БУДЗІНСКІ.

Беларускі Другі Дзяржаўны тэатр

Для дрэсіраванасьцю чыгункаў

Сёньня, 8 студзеня,

„ПЕРШАЯ КОННАЯ"

Пачатак у 8 гадз. увечары.

Запрашэньні спэктакль Менрайсавпрамсаюзу

„ПЕРШАЯ КОННАЯ"

на 11 студзеня 1931 г. перанесена на 10 студзеня г.г. Усе білеты сапраўдны.

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"

ДЭМАСТАЦКІ СЕЛЕМ

ГАРАДЫ І ГАДЫ драма у 9 частках

2) Хроніка Совкіно № 60

3) ГУКАВЫ КІНО-КАНЦЭРТ

Пачатак у 7, 8 г. 45 м. і 10 г. 30 м.

Касе адкрыта з 5 г. веч.

Кіно-тэатр „Культура"

Новы гукавы фільм

КІЯВЕЛЬНІКІ БЛЕДНАЙ ГАРЫ драма у 7 частках

ХРОНІКА СЮЗКІНО № 62.

Пачатак у 7 г., 8 г. 40 м. і 10 г. 20 м.

КАСА АДКРЫТА з 5 гадз.

КІНО „ІСКРА-ГЫЯЛА"

З прычыны вялікага посьпеху

2-гі тыдзень 2-гі

Гістарычны рэжысэрскі

ПАЭТ І ЦАР

Пачатак 1-га сэансу—6 гадз.

Каса—з 4 гадз. 30 м.

КІНО „Спартакіяды"

ГАРТЫЛЬЯНЫ

У дешэвай нямодзі сэзону

Сьвята святора Іергена

у 7 частках.

4 сэансы: 6 г., 7 г. 30 м., 9 г. і 10 г. 30 м.

Каса адкрыта з 4 з пал. гадз.

КІНО „Юны Піянер"

1-я серыя

„ЧЫРВОНЫЯ Д'ЯВ ЛЯТА"

Кіно-аповесьць у 2-х серыях—12 част.

Пачатак: 1 гадз. 2 гадз. і 3 гадз. дня.

Каса адкрыта з 12 г. дня.

КІНО „Спартакіяды"

Бытавы фільм

„ПАЛАЧЫ" у 7 частках

Пач. 1—6 г., 2-й 7 г. 45 м., 3-го 9 г. 30 м.

4-го 11 г. 15 м. Каса—з 5 гадзін.

Менская гарадзкая выбарчая камісія

паведамляе, што ў Менгарсавеце на час справаздачна-перавыбарчай кампаніі

ЎСТАНОЎЛЕНА ДЗЯЖУРСТВА

з членаў гарсавету

па розных пытаньнях, зьвязаных са справаздачна-перавыбарчай кампаніяй гарсавету.

Член гарсавету дзяжурыць у памяшканьні гарсавету, 3-ці паверх, пакой № 6, з 12 да 8 гадз. кожнага тыдзня.

Сацыяльна-бытавы сэктар ЦСПСБ

СКЛІКАЕ

9 студзеня а 7-й гадз. увечары нараду па пытаньні «Аб дзейнасьці Інстытуту Аховы Працы пры НКП БССР» (Дакл.—дыр. інстытуту С. Р. Дзіхчір)

На нараду выклікаюцца кіраўні і сап. бытавых сэктараў ЦП саюзаў, фабзаўмясцкомаў, прадстаўнікі НКПраны, ВСНГ, НКЗдароўя, НКЗему, Навукова-дасьледчых устаноў і наступныя т. т.

Бакшэй Е. М., Хмяльніцкі І. І., Даламінкі М. Б., Фрыдман Н. А., Сосрабагаты М. І., Галіўскі І. Е., Хлаўновіч М. Ш., Тарноўскі Е. Г., Левін Г. І., Левін А. Я., Крамашэў А. І., Еўлінкоўскі Н. Ф., Гольдэ, Лезер, Вайнгаўз, Шульман А. М., Сандлер В. М., Пратас Е. Б., Арлюк А. А., Загальютина С., Цітвер І. Г., Курган Д. Я., Файбышоў І. М., Зусуцкі В. К., Крэнцэ П. Н., Барэн Я. М., Ружынскі, Вальфсон, Чарняков К. В., Кантар М. А., Рохлін Ф. Ш., Жукаборскі С. І., Пісоцкі Р. В., Бурштэйн Ф. Г., Сагалоўіч А. Х., Доўнар Ф. Ф., Эстэркін Б. Ф., Майзель Н. А., Шайкоўскі А. С., Кабакоў І. Х., Гітлін і Паўлоў.

Яўка ўсіх абавязкова.

Нарада адбудзецца у залі пасяджэньняў ЦСПСБ, пакой 10.

МАГІЛЕЎСКІ БЕЛПЭДТЭХНІКУМ на 20 студзеня 1931 г.

скліча

канфэрэнцыю ўсіх скончыўшых гэты тэхнікум

за школьныя адзаконьні у маі, верасьні і лістападзе месяцах 1930 году

з парадкам дня:

1) Вопыт працы у масавай школе (вопыт з месц).

2) Шляхі політэхнізацыі масавых школ.

3) Школа і калгасная будаўніцтва.

Запрашаюцца настаўнікі 1-га концэнтру школ Магілеўскага і Лупалаўскага раёнаў.

Тэхнікум гарантуе абеспячэньне харчаваньнем і інтэрнатам. Аб праезных білетах дагаварыцца з інспэктарамі па месцы працы.

Канфэрэнцыя працягнецца 2 дні.

Просьба не позьней 15 студзеня прислаць свае адрасы і паведаміць аб прыезьдзе на канфэрэнцыю.

Дырэктар тэхнікуму Воўкаў.

Менская праектна-мантажна-гандлёвае аддзяленьне

Усесаюзнага электратэхнічнага аб'яднаньня

„ВЭО"

даводзіць да ведама ўсіх дзяржаўных і каапэратыўных прадпрыемстваў, што з 1-га студзеня 1931 г.

кабэльная прадукцыя, выраблеваная заводамі «ВЭО», разьмяркоўваецца

у цэнтралізаваным парадку

выключна праз камэрцыйнае прадпрыемства «ВЭО» ў Маскве,

з прычыны чаго ўсе заказы на кабэльныя вырабы належыць накіроўваць на адрас: «Москва, Армянский пер., № 6, комн. 43, Коммерческое Управление ВЭО, кабельная группа».

Усіх галінавых аб'яднаньняў належыць падаваць заказы ў цэнтралізаваным парадку на аснове выдзеленых ім фондаў ПТЭУ ВСНГ СССР, аб чым галінавыя аб'яднаньні павінны паведаміць свае філіялы.

Заказы на мантажныя работы прымаюцца пакуль без абавязацельства паставкі кабэльных вырабаў, г. зн. з кабэльнымі вырабамі заказчыкаў.

Уся арматура да алюмініевых і сталь-алюмініевых кабэляў, а таксама высокавольтныя ізалятары будуць разьмяркоўвацца пакуль сфармаванай арматурна-ізалятарнай групай камэрцыйнага кіраўніцтва «ВЭО».

Такія чынам, заўкі на названыя арматуры і ізалятары праходзяць такім-жа парадкам, як і кабэльныя вырабы, праз галінавыя аб'яднаньні.

Адміністрацыя.

МЕНСКАЯ ГАРАДЗКАЯ АШЧАДКАСА І МЦРК

паведамляюць, што з сёньняшняга дня

ПАЯВЫЯ ЎЗНОСЫ Ў МЦРК

МОГУЦЬ ПРАВОДЗІЦЦА

БЕЗНАЯЎНЫМ РАЗЬЛІКАМ

шляхам зьмяшчэньня з свайго рахунку і залічэньня на рахунак МЦРК

ЖЫРА-ЗАГАДАМІ.

Уклодчык атрымлівае поштай ад ашчадкасы на суму перакладу паю паведамленьне, якое магазины МЦРК прымаюць за ўплату паявых узносаў.

Бланкі жыра-загадаў можна атрымаць у магазинах МЦРК і ашчадкасах дармова.

Пересылка праз пошту жыра-загадаў праводзіцца дармова.

Дом Чырвонай армії

ДЛЯ НАЧСКЛАДУ ГАРНІЗОНУ

9 студзеня ў 20 гадз. дакл. тав. Максімэнка

„Матарызацыя і мэханізацыя за мяжой і ў нас"

12 студзеня, у 20 гадз., дакл. т. Сіманоўскага

„Узаемадзеяньне авіяцыі з Р. О."

Запрашаецца начскład завсу г. Менску.

Уваход па вучотных білетах.

У сувязі з вялікімі канікуламі ў навучальных установах,

рэдакцыя газэты «БЕЛАРУСКАЯ ВЁСКА»

у чацьвер, 8-га студзеня, ў 3-й гадзіны дня ў памяшканьні рэдакцыі газ. «Беларуская Вёска» (Савецкая 68, 2-гі паз.)

СКЛІКАЕ

пашыраную нараду селькораў-студэнтаў

на пытаньнях аб удзеле студэнтаў-карэспандэнтаў у падрыхтоўцы да веснавой сяўбы і ўдзеле ў падрыхтоўцы да Усесаюзнай нарады па пытаньнях рабселькораўскага руху.

На нараду запрашаюцца карэспандэнцкія брыгады рабфаку, Транспартна-эканомічнага тэхнікуму, аспірантурных падкурсаў, а таксама ўсе выдзяючыя ў вёску студэнты-карэспандэнты Белпэдтэхнікуму, 2-х гадовых падкурсаў, Політэхнікуму і іншых навучальных устаноў.

Да ведама ўсіх ячэек МОПР'у г. Менску.

9 студзеня ў 7 г. веч. у пам. ЦК МОПР'у БССР адбудзецца

1-шы арганізацыйны с х о д

курсантаў месячных курсаў нізавога актыву МОПР'у,

якія арганізаваны ЦК МОПР'у БССР сумесна з Гаркомам МОПР'у.

Усе ячэйкі МОПР'у г. Менску павінны прислаць да вызначанага дня і часу сваіх старшынь і сакратароў ячэек МОПР'у. Яўка абавязкова.

ЦК МОПР'у БССР.

Сёньня, 8-га студзеня, у памяшканьні клюбу Эльводу адбудзецца

агульны сход брыгады

КАМІСІІ ПА ЧЫСТЦЫ

ІНСТЫТУТУ АХОВЫ ПРАЦЫ

сумесна з супрацоўнікамі Інстытуту.

Парадак дня: даклад аб дзейнасьці інстытуту аховы працы.

Запрашаюцца рабочыя Эльводу, брыгадзіры і ўсе зацікаўленыя ў працы інстытуту.

Сёньня 8-г у 10 гадзін раніцы ў залі пасяджэньняў БАН НК РСІ склікае

нараду брыгадзіраў і адказных прадстаўнікоў

ніжэйспісаных устаноў па пытаньні агляду працы і становішча БАН.

Наступныя установы і прадпрыемствы павінны прислаць сваіх прадстаўнікоў на нараду: 1) фабнон за воду «Энергія», 2) фабнон заводу «Камунар», 3) Нацкамісія ЦВК БССР, 4) ЦСПСБ, 5) Наркомасьветы, 6) Наркам. Аховы Здароўя, 7) ЦП саюзу працаўсьвет., 8) Сэкцыя навуковых працаўнікоў, ВСНГ БССР, 9) Калгасцэнтр, 10) Наркомзем, 11) Белкамсаюз, 12) Індэкстут, 13) БДУ, 14) хім.-тэх. інстыт., 15) Інстытут прамысловасьці, 16) БелНТП, 17) Канвуз, 19) сакрэтары газэт: «Зьвязда», «Савецкая Беларусь», «Рабочы», «Орша» і Літоўская газэта.

АДЗІНОКІ

Шукае пакой

Звяртацца ў рабфак Камароўкі. Аплата на згодзе. Званіць 8-03 (тры вольтры) Мікуліч

9-га студзеня ў 6 гадзін вечара ў МАСАВЫМ СЭКТАРЫ ЦСПСБ (Дом Працы, 2-гі паверх, пакой № 11)

СКЛІКАЕЦЦА

нарада добраахвотнікаў масавага сэктару

па пытаньні АБ ПЕРАВЫБАРАХ САВЕТАЎ.

На нараду павінны зьявіцца наступныя т. т.: І. Рудзінкі, Цыпман, Чаўскі, Клацко, Добгін, Файн, Астрахан (зав. «Камунар»), Шэрман, Шарман, Рабіновіч І., Ліхтэрман, Ліхтман, Гурвіч І., Рыўкін, Сослан (зав. «Вальшавік»), Стоіна, Мятлінкая, Паўловіч, Не рэм, Свяінскі, Марголіна Пляпачнік, Фрыдлянд, Алдзіанкіна, Суботка, Зялёнкіна, Капялевіч, Перольман, Марман, Чарнецкі (шкотачная фабрыка).

10-і у 6 гадзін увечары (у памяшканьні НКЮ, вуліца Керла Маркса, 5, у залі судовых пасяджэньняў, 3 паверх) адбудзецца

пасяджэньне Бюро Скаргаў НК РСІ,

на якім будуць разглядацца наступныя пытаньні:

1. Аб недахопах у рабоце пракуратуры Рэспублікі.
2. Аб стане вучастковых пракуратур Барыскага і Лёзьненскага раёнаў.
3. Справа аб браке працы на пабудове стандартнай справай вёскі ў калгасе «Камінтэрн».
4. Справа аб перавозце загадчыкам Мсьціскай больніцы доктара Гайзінсона.
5. Справа былой студэнткі медінстытуту Равенрод.
6. Справа аб неправільным рашэньні справы грамадзян Ревак, Тунка і Жаўлінкіна—Гомельскай пракуратурай.
7. Справа аб неправільным высяленьні нарсудом 3-га вуч. Рэвалюцыі з кватэры прыватнага гр-на Клыка.
8. Справа аб спатканьні грошай Гавакуўскім ЦВК з гр-на Бондара за недастаўку дроў.

Усе товарышы, якія маюць справы дзвігчась, павінны зьявіцца. Выклікаюцца рабочыя засяданьня бюро скаргаў: т. т. Фрыдман, Таберыскі, Канецкі, Ломскі, Шэпоўская, Бяда-Рэчк і Мілеўскі (зав. «Большавік», Чарнас і Заблоцкі (гарадзкавод), Пралетары), Гардон і Ганько (дом урэду).

Запрашаюцца члены саюзу.

Загадчык бюро скаргаў Жолудаў.

Для здачы

Абвесткі у газэту „Зьвязда" звяраюцца па тел. 7-81

Мяняю пакой у МЕНСКУ на пакой у МАСКВЕ. Даведацца: Новаласкоўская, 39, кв. 2, Гурвіч.

Кошт публікацыі аб згубе і дакумэнту 1р.

9 студзеня у 6 гадз. веч.

МЕНГАРКОМ КП(б)Б разам з РЭДАКЦЫЯМІ ЦЭНТРАЛЬНЫХ ГАЗЭТ

СКЛІКАЕ

Зала пасяджэньняў МЕНГАРКОМУ (вул. Энгельса)

агульна-гарадзкую нараду рабкораў і радкалегій шматтыражак і насьценгазэт.

У ПАРАДКУ ДНЯ:

а) Задачы рабкораў у барацьбе за прамфінплян 3-га году пяцігодкі і суддоклады радкалегій шматтыражак заводаў: «Камунар», «Энергія», «Вальшавік» і «Кастрычнік» аб вопыце барацьбы рабкораў за прамфінплян 2-га году пяцігодкі.

б) Аб удзеле шматтыражак і насьценных газэт у перавыбарчай кампаніі гарсавету.

в) Аб прымацаваньні шматтыражак да радкалегій цэнтральных газэт.

На нараде павінны абавязкова прысутнічаць дырэктары прадпрыемстваў, сакратары партячэек, радкалегіі ўсіх шматтыражак і насьценгазэт і рабкоры цэнтральных і фабзаводзкіх газэт.

Згубленыя і украдзеныя дакумэнты

пічыць несапраўднымі

Ас. кн. Семк.-Гар. РВК Ліхача Я. Ф., 3371; дав. аб выб. пр. Мен. мін. Упдзіцкага М. І., 3372; дав. з больн. Акаловіча Я. І., 3373; вайск. біл. Сьміл. РВК, канд. карт. № 33304 Сьміл. РК КП(б)Б Песенька А. С., 3374—3375; ас. кн. Старасельск. РВК, шлюб пасьв. Мен. ЗАГС, 2 апл. тал. МЦРК Чеканоўскага Я. С., 3376—3378; чл. кн. № 1540 Маг. акр. адд. с. харч. Мінчанкі Т. Я., 3379; вайск. біл. Вабр. ваенк., чл. біл. с. буд. Окуня М. А., 3380—3381; прап. сьніс Мен. акрэа Ярлупаўскага В. І., 3382; парт. біл. № 0814636 Мен. АК КП(б)Б, пасьв. на пр. пап. абр. Мен. ДПУ Сьцідэрскага С. Ю., 3383—3384; мэтр. вып. Гом. ЗАГС Цёмкіная Е. Г., 3385; папш. Мен. мін. Савульскай С. Р., 3386; пасьв. аб сканч. 9 кл., дав. аб выб. пр. Мен. мін. Фукс Г. Г., 3387—3388; папш. Мен. мін. Фітэрсона Ш. Ш., 3389; пасьв. № 62 БПТ Акімавай М. А., 3390; каап. кн. спаж. т-ва «Зямляроб» Яранэвіча Е. Н. 3391; квіт. № 61 аб упл. пад с. палаўн. Дубавецкага Я. А., 3392; чл. біл. с. нархарч № 1898 Барэн Ю. М., 3393; камс. біл. Кастр. РК ЛКСМБ, чл. біл. с. СГО Гарэліка П. К., 3394—3395; ас. кн. Станьк. РВК Сауко Г. Д., 3396; вайск. біл. Лаг. РВК Пучэн М. А., 3397; залік кн. № 93 мад. інст. Сомава І. І., 3398; камс. біл. Фрунз. РК ЛКСМБ, чл. біл. с. харч № 1440 Каковіча Ф. А., 3399—3400; папш. Мен. мін. Кельмана Я. Х., 3